Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР

№ 17 (567) | Панядзелак, 27 мая 1946 г. | Цана 50 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Нік. Брыкін—новыя кнігі Ленінградскага Аддзялення Выдавецтва «Совецкі пісьменнік» (1 стар.)
Л. Бараг—Гераічныя традыцыі заходне-славянскай літаратуры (2 стар.).
Н. Глебка—Маленькія людзі вялікай справы (2 стар.)
Ілья Гурскі—«Свае людзі» (урывак з п'есы) (2 стар.)
К. Губарэвіч—Тэма сталінскай пяцігодкі. (3 стар.).
Т. Бушко—«Запрацаваны хлеб» (спектакль у тэатры імя Янкі Купалы) (4 стар.).

ЛЕТНІ СЕЗОН

З надыходам летняга сезона асабліва павялічваецца роля і ўзмацняецца дзейнасць такіх арганізацый, як Філармонія і Эстрада. Калі ў зімовы час колькасць канцэртных пляцовак была абмежаванай, дык летам яна значна павялічваецца за лік летніх эстрад, пляцовак у парках культуры і адпачынку і рабочых садах. Гэта ўскладае на кіраўнікоў канцэртных арганізацый вялікую адказнасць. Яны павінны спланаваць і забяспечыць абслугоўванне канцэртамі не толькі сталіцу рэспублікі, абласныя і раённыя цэнтры, але таксама мястэчкі і вялікія вёскі.

Разглядаючы вынікі зімовага сезона, трэба перш за ўсё адзначыць, што тут не было планавай і арганізаванай работы. Звернемся да канкрэтных прыкладаў, што мелі мейсца ў Мінску. Канцэрты, якія праводзіліся ў Акруговым Доме афіцэраў, былі двух тыпаў—філарманічныя і эстрадныя. У першых пераважалі сімфанічныя праграмы, у другіх—змешаныя. Аднак, гэтыя праграмы як правіла складаліся стыхійна (творы беларускіх кампазітараў перамешваліся з заходне-еўрапейскімі, а эстрадныя нумары з філарманічнымі і г. д.). Вельмі мала было тэматычных канцэртаў, амаль не практыкаваліся індывідуальныя канцэрты лепшых майстроў сцэны.

Эстрада ўсё яшчэ частуе нашых слухачоў старымі «жартамі» гумарыстаў Горскага і Сімарава, недарэчнымі магіямі буфонна-цыркавога гатунку Раеўскага, пустымі песенькамі Пісьмана, прымітыўнымі танцамі Коціна. Зразумела, мастацкая якасць гэтых нумароў стаіць на нізкім узроўні і наўрад ці выхоўвае патрэбны густ у гледача і дае яму пэўнае задавальненне.

Што-ж мяркуе паказаць Філармонія і Эстрада ў летнім сезоне?

Філармонія адводзіць асноўнае мейсца ў будучым плане канцэртаў артыстам, запрошаным на гастролі ў Беларусь з Масквы. Яна абяцае праз Усесаюзнае гастрольна-канцэртнае аб'яднанне запрасіць у хуткім часе такіх майстроў мастацтва, як Казлоўскі, Барсава, Ойстрах, Нейгауз, Э. Гілельс, Тамаркіна, Гальштэйн, Зак і іншыя. Гэтае пачынанне Філармоніі вельмі каштоўнае і яго трэба ўсяляк вітаць.

Беларуская Дзяржаўная эстрада не зрабіла і гэтага, яна нават яшчэ не склала плана работы на летні сезон.

Мы паважаем і цэнім артыстаў, якія прыязджаюць да нас. Аб гэтым сведчаць хаця-б канцэрты выдатнай балерыны Ольгі Лепяшынскай. Аднак, побач з гэтым, нам не трэба забывацца на нашы беларускія канцэртныя сілы. Але Філармонія, якая мае добры ансамбль беларускай народнай песні і танца пад кіраўніцтвам Р. Шырмы, да гэтага часу не здолела больш-менш поўна паказаць яго грамадскасці сталіцы. Зусім невядома, што робіць аркестр народных інструментаў. Мала выступаюць выдатныя беларускія цымбалісты: Жыновіч, Навіцкі, Шмелькін.

Ад работнікаў Філармоніі і Эстрады часта можна пачуць папрокі нашым пісьменнікам і кампазітарам аб тым, што яны не ствараюць рэпертуара для канцэртаў. Драматургічная секцыя Саюза совецкіх пісьменнікаў Беларусі фактычна не існуе. Хаця пры належных абставінах знайшліся-б людзі, якія з поспехам маглі-б пісаць для эстрады. Што датычыцца беларускіх кампазітараў, дык нельга сказаць, каб у іх не было твораў, бо Мінская радыёстанцыя часта перадае і песні, і ўрыўкі з опер, і квартэты, і нават сімфоніі. Значыць, пры жаданні можна было-б правесці некалькі канцэртаў беларускай музыкі.

Чым-жа вытлумачыць аднастайнасць эстрадных жанраў?

Абмежаванай колькасцю калектываў? Не. У сістэме эстрады ёсць і тэатр мініятур, і калектыў «Цырк на сцэне» і г. д. Аднастайнасць эстрадных жанраў тлумачыцца двума прычынамі: адсутнасцю арыгінальнага, актуальнага рэпертуара і нізкай кваліфікацыяй актораў. Усё робіцца па трафарэту. Адно і тое-ж перапяваецца дзесяткі разоў. Да рэчы, у нашым перыядычным друку і ў беларускай мастацкай літаратуры артысты могуць знайсці сабе шмат матэрыялу. Вершы, апавяданні, урыўкі з паэм, аповесцяў, раманаў, жарты, фельетоны і г. д. маглі-б быць нядрэнным рэпертуарам для эстраднікаў размоўнага жанра.

Канцэртныя арганізацыі абмяжоўваюцца правядзеннем выступленняў нязначнай колькасці вядомых ужо артыстаў, а шматлікія акторскія кадры і асабліва моладзь не ўключаюцца ў канцэртныя праграмы. Артыстычныя сілы музычных і драматычных тэатраў яшчэ мала выкарыстоўваюцца Філармоніяй і Эстрадай. Даўно не выступалі ў эстрадных канцэртах народная артыстка СССР і БССР Л. Александроўская, народная артыстка БССР Л. Ржэцкая, заслужаныя артысты БССР Б. Кудраўцаў, І. Шаціла, С. Бірыла. Чамусьці спыніў сваю работу музычны лекторый Філармоніі БССР.

Філармонія мае яшчэ на мейсцах абласныя філіі, якія па ўласнай ініцыятыве намагаюцца сабраць вакол сябе мастацкія сілы обласці. Так, у Мозыры быў створаны этнаграфічны ансамбль беларускай народнай песні і танца, у Брэсце—тэатр мініятур, у Баранавічах—джаз. Але гэтымі калектывамі ні Філармонія, ні абласныя аддзелы па справах мастацтва не цікавяцца і не кіруюць імі. Аб росце і творчай працы, як калектываў, так і асобных артыстаў павінна перш за ўсё клапаціцца Філармонія і Эстрада.

Нельга згадзіцца і з тым становішчам, што дзяржаўны джаз БССР пад кіраўніцтвам заслужанага артыста рэспублікі Эдзі Рознера прыязджае да нас толькі ў госці, а ўвесь астатні час на працягу года ён гастраліруе за межамі Беларусі. Прычым, рэпертуар гэтага калектыва далёка не адпавядае яго назве.

Неабходна аднавіць даваенную традыцыю, каб на гастролі ў Мінск прыязджалі тэатры Масквы, Ленінграда, Украіны. Хацелася-б больш сустракаць на сталічнай сцэне нашы дзяржаўныя тэатры, што маюць базы ў абласных цэнтрах, а таксама лепшыя абласныя канцэртныя калектывы.

Філармонія і Эстрада павінна змагацца супроць халтуры, якая больш за ўсё мае мейсца на перыферыі. Патрэбна ўзняць сваю адказнасць перад гледачом. Пад маркай Філармоніі амаль цэлы год працуе нейкі тэатр вадэвіля, які нікім не зацверджаны і па-халтурнаму ставіць вадэвілі «Бедны Федзя», «Цёшча ў дом—усё ўверх дном» і інш. Але гэты «тэатр» выязджае за межы рэспублікі і прадстаўляе там беларускае мастацтва. Быў выпадак у Магілеве, калі некаторы час там гастраліраваў невядомы нікому цыганскі ансамбль. Ад такіх вандроўных, ці, як у асяроддзі работнікаў мастацтва называюць «дзікіх» брыгад і калектываў, трэба пазбавіцца. Барацьба з халтурай значна ўздыме мастацкую якасць канцэртных праграм.

У гады Вялікай Айчыннай вайны нашы лепшыя артысты, выступаючы на фронце і ў глыбокім тыле, набылі вялікі творчы вопыт. Трэба, каб ён быў выкарыстаны і цяпер у часы аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі.

Камітэт па справах мастацтва пры Совеце Міністраў СССР у звароце да рэспубліканскіх Кіраўніцтваў і абласных аддзелаў па справах мастацтва ясна вызначыў задачы летняга сезона на 1946 год: «Для абслугоўвання паркаў культуры і адпачынку браць лепшыя мясцовыя і артыстычныя сілы, тэатральныя і канцэртныя калектывы і артыстаў з іншых гарадоў у гастрольным парадку».

Мастацкія сілы ў нас ёсць, рэпертуар яны могуць сабе падрыхтаваць, толькі неабходна накіраваць іх дзейнасць на стварэнне арыгінальнага беларускага рэпертуара, сугучнага сённяшняму дню—дню новай сталінскай пяцігодкі.

Старшыня Совета Міністраў БССР і Сакратар ЦК КП(б) Беларусі Панцелеймон Кандрацьевіч Панамарэнка аглядае з групай архітэктараў генеральны план аднаўлення горада Мінска.

Фота В. Лупейкі.

ЭСТРАДА ЛЕТАМ

Калектыў тэатралізаванага джаза Беларускай Дзяржаўнай эстрады ў канцы мая выедзе на гастролі ў Мозыр, Пінск, Брэст. У рэпертуары джаза творы совецкіх і заходне-еўрапейскіх кампазітараў, характэрныя і рытмічныя танцы, жанравыя і лірычныя песні.

У Брэсцкую абласць у маі выедзе тэатр мініятур. Затым ён выступіць у Мінску і абласных цэнтрах рэспублікі. Будуць пастаўлены п'есы І. Лукоўскага «Справа №79», Л. Ленча «Тры сэрцы», В. Маса і А. Чэрвінскага «Марная прадасцярога».

Эстрадная брыгада «Цырк на сцэне» дасць рад канцэртаў у раённых цэнтрах рэспублікі.

Артысты Беларускай Дзяржаўнай эстрады пачалі падрыхтоўку да Усесаюзнага конкурса артыстаў эстрады.

Нарада работнікаў кінематаграфіі з пісьменнікамі

Днямі ў Міністэрстве кінематаграфіі БССР адбылася нарада работнікаў кіно і беларускіх пісьменнікаў, прысвечаная абмеркаванню тэматыкі сцэнарыяў на бліжэйшыя пяць год. Нараду адкрыў міністр кінематаграфіі тав. М. Садковіч.

У сваім выступленні ён адзначыў, што перад работнікамі кіно і літаратуры стаяць неадкладныя задачы па стварэнню арыгінальных фільмаў, якія-б адлюстравалі гераічную барацьбу беларускага народа супроць нямецкіх захопнікаў і велізарнейшую работу па аднаўленню і будаўніцтву народнай гаспадаркі рэспублікі.

У абмеркаванні пытанняў па напісанню новых кіносцэнарыяў прынялі ўдзел пісьменнікі Міхась Лынькоў, Максім Танк, Піліп Пестрак, Алесь Кучар, Павел Кавалёў і Цімох Крысько. Яны адзначылі, што сама тэматыка—паказ гераікі партызанскай барацьбы нашага народа і грандыёзнай працы па аднаўленню народнай гаспадаркі—патрабуе стварэння вобразаў людзей вялікай ідэі, вобразаў, якія-б увасобілі ў сабе лепшыя рысы нашага народа.

На нарадзе пісьменнікі ўзнялі і некаторыя арганізацыйныя пытанні. Было вырашана, што кіносцэнарый аб партызанскай барацьбе ў Беларусі, у якім будзе адлюстравана кіруючая роля большэвіцкай партыі, павінен пісаць калектыў аўтараў. Пісьменнікі возьмуцца таксама за напісанне сцэнарыяў на тэмы аднаўлення гаспадаркі краіны, тэмы, якія-б паказвалі сучаснае жыццё.

Новыя кнігі Ленінградскага Аддзялення Выдавецтва „Совецкі пісьменнік"

Да вайны Ленінградскае Аддзяленне Выдавецтва «Совецкі пісьменнік» з'яўлялася цэнтрам літаратурнага жыцця Ленінграда. За год яно выпускала да ста кніг ленінградскіх аўтараў.

У сучасны момант Выдавецтва зноў аднавіла сваю работу на значна пашыранай базе. Па колькасці кніг, якія будуць выдадзены, Выдавецтва «Совецкі пісьменнік» будзе адным з першых сярод ленінградскіх выдавецтваў. Ужо цяпер у вытворчасці знаходзіцца каля васьмідзесяці раманаў, аповесцей, зборнікаў вершаў і кніг з вялікай серыі «Бібліятэка паэта».

Як і да вайны, выдавецтва будзе выпускаць сучасную прозу, паэзію і серыю кніг «Бібліятэка паэта» — заснаваную М. Горкім. У план выдавецтва на 1946 год уключаны таксама пераклады лепшых твораў пісьменнікаў братніх рэспублік.

Да вайны кнігі нашага выдавецтва выходзілі тыражом пяць-дзесяць тысяч. Вялікая патрэба ў кнігах, неабходнасць аднаўлення спаленых фашысцкімі вандаламі бібліятэк у мясцовасцях, што былі акупаваны нямецкімі захопнікамі, прымусіла выдавецтва павялічыць тыражы выданняў у два-тры разы. Большасць кніг цяпер выдаецца тыражом у дваццаць—сорак тысяч.

Што мы дадзім нашаму чытачу ў гэтым годзе?

Большасць ленінградскіх пісьменнікаў былі на фронце. Цяпер яны вярнуліся ў Ленінград і прыступілі да працы. У вытворчасці ўжо многа кніг, аб Вялікай Айчыннай вайне. Пералічым некаторыя з іх: аповесці Юрыя Германа, сабраныя ў кніжцы «Каля сцюдзёнага мора»,—малююць вобразы бясстрашных лётчыкаў і маракоў—адданых абаронцаў Радзімы; раман А. Зоніна «Марское братэрства» расказвае аб гераічных учынках ваенна-марскога флота ў барацьбе з нямецкімі марскімі піратамі; кніга апавяданняў А. Вераб'ёва «Гонар пяхоты» знаёміць нас з легендарнымі ўчынкамі гераічных пехацінцаў; аповесць Нікалая Вагнера «Маё мора» апавядае аб гераічнай барацьбе рускага народа з нямецкімі захопнікамі ў суровай Арктыцы. Усе гэтыя кнігі на працягу бліжэйшых месяцаў атрымае совецкі чытач.

Апрача кніг аб Вялікай Айчыннай вайне днямі паступяць на кніжны рынак: раман Крата «Востраў Баранава», дзе даюцца вобразы смелых людзей—першых рускіх мораходаў, якія на невялікіх суднах дасягалі берагоў далёкай Аляскі. Кніга аповесцей Е. Фёдарава «Кыштымскі звер» аб мінулым і сучасным Урала; гістарычны раман узбекскага пісьменніка Айбек «Навоі» аб жыцці і дзейнасці вялікага узбекскага паэта і дзяржаўнага дзеяча Алішара Навоі. Гістарычны раман Вольгі Дзімітраўны Форш «Міхайлаўскі замак»—першая частка трылогіі, якая прысвечана будаўніцтву нашага вялікага горада; раман Н. Задорнава «Амур-бацька» аб сібірскіх таежніках і аб асваенні гэтага выдатнага краю. Кніга уральскіх апавяданняў Ніны Паповай, раман Е. Кацерлі аб вялікім паэце Некрасаве, новая кніжка вершаў лаўрэата Сталінскай прэміі А. Суркова «Я спяваю перамогу», паэма Панава «Барэнцава мора», гістарычная трагедыя Сяльвінскага «Бабек», кніжкі вершаў М. Галоднага, Асеева, Благава, Нікалаевай і іншыя.

Да гадавіны з дня смерці Вечаслава Якаўлевіча Шышкова выдавецтва выпускае яго выбраныя творы. Ленінградскі літаратуразнаўца І. Векслер закончыў вялікую манаграфію, якая прысвечана творчасці выдатнага рускага пісьменніка-патрыёта Аляксея Нікалаевіча Талстога. Кніга І. Векслера знаходзіцца ў вытворчасці.

Шырока і рознастайна будзе прадстаўлена ленінградская паэзія. Выйдзе ілюстраваным выданнем новая паэма лаўрэата Сталінскай прэміі Аляксандра Пракоф'ева «Сад», будуць выдадзены кнігі вершаў В. Саянава, В. Раждзественскага, С. Спаскага, М. Камісаравай, Н. Крандзіеўскай-Талстой, В. Шэфнера і інш.

У 1946 г. выйдзе каля 10 кніг з вялікай серыі «Бібліятэка паэта».

Мы мяркуем выдаць у будучым годзе таксама зборнік вершаў Сяргея Есеніна ў адным томе пад рэдакцыяй А. Пракоф'ева, В. Раждзественскага і Г. Сарокіна.

Апрача кніг, якія паступілі ў выдавецтва і знаходзяцца ў вытворчасці, мы разлічваем атрымаць у бліжэйшы час некаторыя рукапісы, над якімі працуюць цяпер ленінградскія аўтары. Да ліку іх належаць: кніга новых апавяданняў Міх. Зошчанкі, раман В. Саянава «Ленінград», раман Нікалая Нікіціна «Сярожа Мігуноў» і многія другія.

Разам з выданнем ленінградскіх пісьменнікаў, выдавецтва дасць краіне ў гэтым годзе рад цікавых раманаў і аповесцяў выдатнейшых маскоўскіх аўтараў і пераклады лепшых твораў пісьменнікаў братніх рэспублік.

Вось некаторыя з іх: раман В. Кажэўнікава «Брат акіяна», кніга Льва Нікуліна «Шаляпін і яго час», апавяданні Б. Гарбатава «Звычайная Арктыка», гістарычная аповесць Раманенкі «Ерафей Хабараў» аб асваенні нашымі продкамі Далёкага ўсходу, гістарычны раман Пятрова «Дзікае поле» аб казацкай вольніцы ў Пятроўскую эпоху, раман Сяргеева «Вараг» аб адным з гераічных эпізодаў руска-японскай вайны 1903—1904 гадоў, раман Антонаўскай і Чарнага «Анёлы свету» аб барацьбе за незалежнасць совецкай Грузіі ў гады інтэрвенцыі, раман Галубова «Стварэнне веку» з эпохі першай імперыялістычнай вайны, гістарычны раман армянскага пісьменніка С. Зор'яна «Цар-Пап», апавяданні І. Меншыкава «Чалавек шукае шчасця» аб заснаванні новай культуры народамі Поўначы і іншыя.

З кніг маскоўскіх паэтаў трэба адзначыць вядомую паэму А. Твардоўскага «Васіль Цёркін», кнігі вершаў Безыменскага, Асеева, Сяльвінскага, Галоднага. Усе гэтыя кнігі знаходзяцца ў вытворчасці і хутка выйдуць у свет.

Як і да вайны, Ленінградскае аддзяленне выдавецтва «Совецкі пісьменнік» будзе падтрымліваць шчыльную сувязь з пісьменнікамі братніх рэспублік—Беларуссю, Украінай, Літвой, Латвіяй, Эстоніяй, Карэла-Фінскай рэспублікай і астатнімі рэспублікамі.

У 1946 г. у Ленінградзе выйдзе вялікім тыражом зборнік выбраных вершаў паэтаў Совецкай Беларусі. Зборнік рэдагуе лаўрэат Сталінскай прэміі паэт Аляксандр Пракоф'еў. У анталогію ўвойдуць вершы Янкі Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, А. Куляшова, П. Глебкі, М. Танка, П. Панчанкі, М. Лужаніна і другіх. Над перакладамі працуюць ленінградскія паэты А. Пракоф'еў, В. Саянаў, Н. Браун, В. Раждзественскі, С. Спаскі, Я. Палонская, М. Камісарава, А. Астроўскі, П. Кабзарэўскі.

Выхаду ў свет выбраных вершаў паэтаў Совецкай Беларусі выдавецтва надае вялікае значэнне. Гэта будзе першая пасляваенная творчая сустрэча ленінградскіх паэтаў з паэтамі Беларусі. Спадзяемся, што яна будзе не апошняй.

На чарзе выданне кнігі выбранай беларускай прозы, над якой выдавецтва пачне працу ў гэтым годзе.

Апрача зборнікаў беларускіх паэтаў выдавецтва мяркуе выдаць у гэтым годзе зборнік выбранай сучаснай эстонскай паэзіі.

У афармленні кніг удзельнічаюць лепшыя ленінградскія мастакі: Епіфанаў, Юдовін, Акімаў, Канашэвіч, Хігер, Альтман, Хіжынскі, Дваракоўскі, Рудакоў, Зянькевіч і іншыя.

Як бачым, план выдавецтва шырокі і рознастайны.

У шчыльным кантакце з пісьменніцкай грамадскасцю, пры падтрымцы партыйных арганізацый, выдавецтва дасць краіне ў 1946 годзе шмат кніг, добра афармленых і цікавых па зместу.

Нік. БРЫКІН,
Дырэктар Ленінградскага Аддзялення Выдавецтва «Совецкі пісьменнік».

Праект будынка Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета

18-га мая 1946 г. у залі паседжанняў Совета Міністраў БССР адбылося абмеркаванне праекта аднаўлення і рэканструкцыі будынка Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета, прадстаўленага заслужаным дзеячом мастацтва БССР акадэмікам І. Лангбардам.

У абмеркаванні прынялі ўдзел: Старшыня Совета Міністраў БССР і Сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка, прадстаўнікі Кіраўніцтва па справах архітэктуры пры Совеце Міністраў БССР, артысты і прадстаўнікі грамадскасці горада Мінска.

Сутнасць рэканструкцыі будынка тэатра заключаецца ў завяршэнні будаўніцтва тэатра, згодна з першапачатковым праектам, з уключэннем скульптуры і жывапісу. Рэканструіруюцца вестыбюлі, лесвіцы, файэ. Па-новаму рэканструіруецца таксама заля для гледачоў, мейсца для аркестра. Работа будзе праходзіць у дзве чаргі. І-ая чарга прадугледжвае работы над сцэнай і заляй для гледачоў. У 2-ую чаргу будуць абсталяваны астатнія аб'екты і закончана архітэктурна-мастацкае афармленне будынка тэатра.

Навіны совецкага мастацтва

У чэрвені 1946 г. спаўняецца дзесяць год з дня смерці вялікага пісьменніка Максіма Горкага. Краіна будзе шырока адзначаць гэты юбілей. Тэатры Совецкага Саюза адзначаць гэтую дату паказам лепшых горкаўскіх спектакляў. Многія тэатры краіны ўключылі ў свае рэпертуарныя планы горкаўскія п'есы.

* * *

Цэнтральны дзіцячы тэатр у Маскве паказаў свайму юнаму гледачу прэм'еру. «Вясёлы сон» лаўрэата Сталінскай прэміі С. Міхалкова. Пастаноўка лаўрэата Сталінскай прэміі В. Калясаева. Мастак спектакля Альберто Санчэс.

* * *

У маі ў Маскоўскім тэатры Юнага Гледача адбылася прэм'ера спектакля А. Бруштэйн і А. Успенскага «Нашчадкі» ў пастаноўцы рэжысёра А. Воўсі. «Нашчадкі» — п'еса аб прыгодах чатырох совецкіх школьнікаў, якія разам са сваім настаўнікам ідуць на экскурсію на Урал. Спектакль афармлены мастаком А. Васільевым.

* * *

У оперна-драматычнай студыі імя К. С. Станіслаўскага ў гэтым месяцы адбыўся двухсоты паказ спектакля «Тры сястры» А. Чэхава ў пастаноўцы народнага артыста РСФСР М. Кедрава.

* * *

У сувязі з 30-годдзем з дня смерці класіка яўрэйскай літаратуры Шолам-Алейхема Саюз совецкіх пісьменнікаў СССР 17 мая ў калоннай залі правёў вялікі літаратурна-мастацкі вечар.

Уступнае слова зрабіў народны артыст СССР С. Міхоэлс.

На вечары выступілі пісьменнікі Д. Бергельсон, Л. Собалеў, П. Маркіш, Л. Квітко, артысты В. Зускін, Ірма Яунзем, Эмануіл Камінка, С. Хромчанка і інш.

* * *

Украінскі пісьменнік Олекса Капыленка закончыў працу над камедыяй «Ці даўно вы вярнуліся?» Камедыя напісана на матэрыяле нашай сучаснасці і расказвае аб совецкіх людзях, якія вярнуліся пасля вайны ў свой родны, разбураны немцамі, горад і пачалі нанава адбудоўваць і сваё жыццё і горад. На рускую мову камедыя перакладзена І.л. Барашкам і будзе пастаўлена ў гэтым годзе Маскоўскім Музычна-драматычным тэатрам. Рэжысёр спектакля Ю. Коршун.

* * *

З 22-га мая, на працягу некалькіх дзён, у Рызе праходзіла куставая канферэнцыя, на якой былі абмеркаваны спектаклі рускай класічнай драматургіі, што паказваліся на аглядах у Беларусі, Літве, Латвіі і Эстоніі. У канферэнцыі прынялі ўдзел: начальнік аддзела тэатраў Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР Ул. Няфёд, рэжысёр Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета В. Барысевіч, рэжысёры Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР С. Уладычанскі і Ю. Арынянскі, народныя артысты БССР Г. Глебаў, І. Ждановіч, А. Ільінскі, П. Малчанаў, Л. Рахленка, заслужаны артыст БССР Я. Рамановіч, драматург М. Клімковіч і дырэктар Рэспубліканскага Дома народнай творчасці Л. Ярмоліна.

НА ГАСТРОЛІ Ў МІНСК

Па запрашэнню Беларускай Дзяржаўнай Філармоніі на гастролі ў Мінск прыязджае ансамбль песні і танцаў пагранічных войск Міністэрства Унутраных спраў СССР у складзе 120 чалавек. Мастацкі кіраўнік ансамбля—Школьнік.

За летні сезон сталіцу Беларусі наведаюць народныя артысткі СССР лаўрэаты Сталінскай прэміі В. Барсава і Зоя Гайдай, выканаўца песень народаў СССР заслужаная артыстка РСФСР Ірма Яунзем, саліст Вялікага тэатра оперы і балета СССР народны артыст Грузінскай ССР Лісіцыян, арфістка Эрдэлі і майстра мастацкага чытання Антон Шварц.

На гастролі ў Мінск таксама прыедуць скрыпачы Д. Ойстрах і Б. Гальдштэйн, піяністы М. Фіхтэнгольц і прафесар Нейгауз.

Апрача таго, перад працоўнымі Мінска выступяць Ленінградская Акадэмічная капэла, рускі народны хор пад мастацкім кіраўніцтвам Свешнікава і ансамбль танцаў Грузіі.

Фабрыка піяніна ў Барысаве

Да вайны ў Барысаве працавала фабрыка па вырабу музычных інструментаў. Нямецка-фашысцкія захопнікі разбурылі яе і знішчылі ўсё абсталяванне. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкай акупацыі пачаліся работы па аднаўленню фабрыкі піяніна. Амаль поўнасцю адноўлена вытворчая плошча, падрыхтавана абсталяванне, распрацаваны тэхнічны праект вытворчасці. Хутка ў зборку будуць пушчаны першыя 10 піяніна, дэталі для якіх атрыманы ад Ленінградскай фабрыкі музычных інструментаў.

Л. БАРАГ

Гераічныя традыцыі заходне-славянскай літаратуры

(Кароткі агляд)

Высокая культура заходняга славянства стваралася ў шматвяковай барацьбе з германскімі захопнікамі. Ужо першыя чэшскія асветнікі IX стагоддзя абракаліся на выгнанне нямецкімі князямі, якія авалодалі Чэхіяй. Антыславянскі характар дзейнасці гэтых князёў трапна вызначыў аўтар адной сярэдневяковай чэшскай хронікі: «Калі вамі валодаць будзе чужаземец, то мова ваша нядоўга пратрымаецца. Хутчэй змяя сагрэецца на лёдзе, чым немец пажадае чэху дабра».

Першае выяўленне нацыянальнай самасвядомасці ў новай чэшскай літаратуры XIX стагоддзя—паэма Яна Калара «Дачка Славіі». Гэтая паэма прасякнута духам барацьбы супроць нямецкага заняволення, якое прынесла тугу і спусташэнне ў Чэхію і Славакію. Заснавальнік новай славацкай паэзіі Ян Болый праславіў барацьбу супроць нямецкага панавання ў сваіх гістарычных паэмах «Святаполк» і «Кірыл і Мефодзій». Пазней чэшскія паэты не адзін раз прысвячалі свае паэмы і драмы барацьбе з германскай агрэсіяй. Зазначым, напрыклад, на выдатныя паэмы Сваталлука Чэха «Жыжка» і «Вацлаў з Міхайлавіц».

Адменнае мейсца ў чэхаславацкай літаратуры займаюць творы Алоіза Іросека, выдатнага майстра гістарычнага рамана. Некалькі разоў перакладаліся на рускую мову яго раманы «Псоглаўцы»—пра барацьбу чэшскіх сялян супроць нямецкіх паноў і «Адзін у полі не воін»—гераічная эпапея пра перамогу гусіцкіх войск над немцамі.

Гордасць за гераічнае мінулае і ўпэўненасць у вызваленні ад германскага прыгнечання еднаді чэхаславацкіх паэтаў самых розных кірункаў. Паэт-рамантык 30-х гадоў XIX стагоддзя Вацлаў Стах пісаў:

О, мой народ, ты любы мне і мілы,
Нашчадак слаўных гераічных продкаў,
Што вылюдкаў нямецкіх вынішчалі....
Жахайцеся еднання сіл такіх,
Пачварныя і прагныя тэўтоны,
Як люты шквал, мы грозныя у гневе.

Са Стахам пераклікаецца паэт дэмакратычнага кірунку, народжанага 1848 годам, Карл Гаўлічэк:

Палохайце лёсам цяжкога палону,
Не здраджу народу свайму я да скону.
Прэч немцы! Мой колер чырвоны і белы,
Эмблема свабоды і ўпартасці смелай.
Я—чэх і застануся чэхам заўсёды.

Таленавітай сатырай на рэакцыйную германска-аўстрыйскую сістэму з'яўляецца паэма Гаўлічка «Цірольскія элегіі», у якой паэт апісаў сваё падарожжа пад жандармскім канвоем з роднай Прагі ў аўстрыйскі турэмны замак.

З вялікай гастрынёй паўстала пытанне пра незалежнасць Чэхіі і Славакіі ў XX стагоддзі, калі германскі імперыялізм выказаў імкненне поўнасцю анямечыць прамысловыя краіны сярэдняй Еўропы. Пратэстам супроць гэтай чалавеканенавісніцкай палітыкі прагучалі «Сілезскія песні» буйнага паэта пачатку стагоддзя—Пятра Бязруча.

Як баявы антыфашысцкі покліч гучалі ў гады вайны вершы сучасных чэхаславацкіх паэтаў. Такія, напрыклад, вершы паэта Сілезскай Маравіі Ондры Лысагорскага:

Паўстань народ,—сканае цень;
Зіхціць усход,—то жніва дзень.

З чэхаславацкіх пісьменнікаў антыфашыстаў асабліва вылучаецца Карл Чапек. У фантастычным рамане «Вайна з саламандрамі» ён намаляваў кранаючую карціну разбурэння цывілізацыі пачварамі, узброенымі сучаснай тэхнікай,—саламандрамі. На чале гэтых пачвар стаіць «Чынгісхан саламандр і ўзломшчык кантынентаў... у часы сусветнай вайны ён быў дзесьці фельдфебелем». Незадоўга да смерці Карл Чапек напісаў п'есу «Маці», у якой заклікаў падпарадкаваць усе пачуцці і думкі барацьбе з фашысцкім барбарствам.

Натхнёным барацьбітом супроць нямецкай агрэсіі быў паэт Святаслаў Нейман—аўтар «Гімна Совецкаму Саюзу» і таленавіцейшы перакладчык твораў Маякоўскага на чэшскую мову. Святаслаў Нейман быў па-зверску закатаваны нямецкімі акупантамі ў адным з канцэнтрацыйных лагераў.

Ахвярамі нямецка-фашысцкіх катаў таксама з'явіліся такія таленавіцейшыя чэшскія паэты-антыфашысты, як І. Ольбрахт і Я. Гора. Сёння творы І. Ольбрахта, С. Неймана, Я. Гора, В. Незвола і іншых чэхаславацкіх паэтаў эпохі Вялікай Айчыннай вайны гучаць напамінкам пра неабходнасць поўнага і канчатковага выкарчоўвання карэнняў фашызма ў Германіі і ў некаторых іншых краінах свету.

Побач з чэшскай і славацкай літаратурай слаўныя традыцыі барацьбы з германскай агрэсіяй мае польская літаратура.

Вядомая паэма Адама Міцкевіча «Канрад Валенрод», накіраваная ў асноўным супроць царскай рэакцыі 20-х—30-х гадоў мінулага стагоддзя, з сапраўдным гістарызмам малюе бязлітасную барацьбу рыцараў XIV стагоддзя. Матывамі старадаўніх народных песень навеяны радкі гэтай паэмы:

Скрозь, дзе нямецкія зграі хадзілі,
Зніклі без следу сталіцы і вёскі.
Край наш магільным курганам зрабілі.

Вобраз палымяннага ворага немцаў Канрада Валенрода, сэрца якога гарэла агнём помсты да крыўдзіцеляў народа, набыў у дні Вялікай Айчыннай вайны асаблівую гастрыню і актуальнасць.

Генрых Сянкевіч у рамане «Мечаносцы» паказаў гістарычныя падзеі, якія мяжуюць з эпохай Канрада Валенрода. Сянкевіч выдатна раскрыў ваяўнічую ўзрушанасць польскага і літоўскага народаў перад бойкай на жыццё і на смерць з нямецкімі гвалтаўнікамі, калі польскія сяляне цэлымі вёскамі ўцякалі з пагранічнай Прусіі, каб прыняць удзел у народнай вайне, калі «скрозь стукалі молаты ў кузнях і скрозь чысцілі старыя панцыры» і «кожны глыбока адчуваў у душы, што раз назаўсёды патрэбна скончыць са старым ворагам цэлага племя». Кульмінацыйным момантам у развіцці фабулы рамана «Мечаносцы» з'яўляецца Грунвальдская бітва 1410 года, намаляваная Сянкевічам з незвычайным натхненнем. Прагныя, жорсткія рыцары—мечаносцы, якія не ведаюць літасці, шмат у чым сваякі іх фашысцкім паслядышам.

У творах польскай літаратуры канца XIX і пачатку XX стагоддзяў знайшла адлюстраванне экспансія ў Польшчу германскага імперыялізма. Адзначым, напрыклад, раман Уладзіслава Рэймонта «Зямля абетаваная», у якім ярка выпісаны вобраз нямецкага драпежніка-фабрыканта Кеслера.

Яшчэ сто год таму назад у выдатным памфлеце польскага публіцыста Юліана Клячко—«Нямецкія гегемоны» быў кінуты заклік да актыўнай барацьбы ўсіх славян супроць пагрозы нямецкай агрэсіі. З асаблівай сілай прагучаў баявы заклік у паэзіі Марыі Канапніцкай:

Не будзе шваб пляваць у твар,
Дзяцей не анямечыць,
Абкружым ворага кальцом,
Пойдзем смялей на сечу.

Вершы Канапніцкай былі любімай песняй польскіх партызан у гады барацьбы супроць нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Гераічны пафас і інтымны лірызм зліваюцца ў сучасных партызанскіх вершах — песнях партызанскай паэтэсы Марыі Асіпчук. Аб'яднанне польскіх партызан з беларускімі, рускімі і ўкраінскімі братамі ўслаўляў вядомы паэт сучаснай Польшчы Леон Пастэрнак. Выдатна створаны ім сімбалічны вобраз партызана-паляка, які падае праз галовы нямецкіх акупантаў руку воіну Чырвонай Арміі.

Сусветна вядомыя раманы Ванды Васілеўскай «Вясёлка» і «Песня над водамі» з'яўляюцца сцверджаннем ідэі непарыўнага братэрства польскага народа і народаў СССР, братэрства, загартаванага навечна ў горане Вялікай Айчыннай вайны.

Барацьба супроць падпальшчыкаў новай вайны патрабуе скарыстання ўсіх баявых сродкаў. Адным з іх з'яўляецца паэтычнае слова—выпрабаваная зброя многіх пакаленняў славянскіх пісьменнікаў. Выдатна сказаў пра гэта Сваталлук Чэх:

Нам лёсам дана ў абаронцы
Жывая мова—верны меч.
Яна заўжды гатова ў бойцы
Калоць, крышыць, знішчаць аковы.
І пераможа
І прагрукоча
Жывое наша слова.

Н. ГЛЕБКА

Маленькія людзі вялікай справы

Нашы чытачы чакаюць ад пісьменнікаў твораў пра вялікія справы совецкіх людзей. Пісьменнікі імкнуцца паказаць веліч совецкага чалавека, праўдзіва адлюстроўваючы яго паводзіны і ўчынкі ў вялікім і «малым». Алесь Якімовіч напісаў кнігу апавяданняў «Помста» пра маленькіх сціплых людзей, «якія трымаюць у стане актыўнасці наш вялікі дзяржаўны механізм ва ўсіх галінах навукі, гаспадаркі і ваеннай справы» (Сталін), — людзей вялікай справы.*)

«Андрэйка, сынок! Пачуй мяне, пачуй свайго старога адзінокага бацьку скрозь горы і ўзгор'і, скрозь лясы і пералескі, скрозь палі і пераполлі,—дзе б ні быў ты, пачуй голас—наказ бацькі: пакуль служаць табе рукі-ногі, пакуль бачаць твае вочы—бі немца, помсці немцу! Адпомсці яму за сям'ю сваю, за сястру, за мяне і за ўсю старану нашу».

Вось гэтым вялікім пачуццём нянавісці да ворага, прагным жаданнем вызваліцца з няволі, адпомсціць нямецкім катам за кроў і слёзы народа—і вызначаецца ідэйная накіраванасць усяго зборніка апавяданняў.

Гаротная сялянка Ганна—маці чатырох дзяцей, апынуўшыся пад нямецкаю ўладаю, церпіць страшэнную нястачу. Няма чым накарміць дзяцей, няма ў што іх апрануць, — апошнюю карову забралі немцы. І жанчына ўступае ў барацьбу. Ганна забівае немца, што паквапіўся на апошняе. У душы простай сялянкі паступова нарастала абурэнне, якое ператварылася затым у актыўны пратэст супроць тых нечуваных здзекаў і несправядлівасці, якія прынёс з сабою вораг. (апавяданне «Аладкі»).

А. Якімовіч «Помста», ДВБ, Мінск, 1946 г.

Піонер Геня, з апавядання пад тэй-жа назвай, таксама становіцца актыўным удзельнікам змагання за вызваленне краіны і народа. Геня—не адзін. Яму дапамагаюць таварышы—людзі, якія з'яўляюцца сапраўднымі патрыётамі совецкай радзімы. Тут мы бачым і важатую Маню, і доктара Івана Нічыпаравіча, і старую маці Гені. Той-жа нянавісцю да ворага вызначаюцца і паводзіны Грышкі (апавяданне «Нямецкія цукеркі»).

Можна прыгадаць яшчэ і дзеда Мікіту, які быў вартаўніком управы гарадка Н... Дзед Мікіта вывесіў на страсе ўправы чырвоны сцяг, бо «яму-ж таксама шчыра хацелася прывітаць сваю доўгачаканую Чырвоную Армію такім баявым заклікаючым сігналам. Прывітаць і сказаць: «Жывы мы, таварышы дарагія, як ні лютуюць фашысты. Жывы і чакаем вас з нецярплівасцю» (апавяданне «Сусед справа»).

Названыя творы характарызуюць адну групу апавяданняў, тэму якіх можна вызначыць, як тэму барацьбы совецкіх людзей у тыле ворага.

Другую групу складаюць рэчы аб звычайных совецкіх людзях, якія змагаліся супроць немцаў у радах Чырвонай Арміі. Такія апавяданні, як «Лейтэнанты», «Языковы доўг», «У шпіталі» цалкам пабудаваны на матэрыяле з баявога жыцця Чырвонай Арміі. І тут аўтар ставіць сваіх герояў у такія сітуацыі, бярэ такія эпізоды, якія падкрэсліваюць асноўную ідэю ўсяго зборніка—ідэю помсты.

Найбольшае ўражанне робіць апавяданне «Лейтэнанты», у якім гаворыцца аб простым гераічным учынку малодшага лейтэнанта авіяцыі Аляксея Дземяшкевіча.

Аўтар раскрывае перад намі псіхалогію совецкага байца, паказвае праз адну маленькую дэталь, як асабістыя пачуцці чалавека перарастаюць у агульныя грамадскія пачуцці і настроі.

Нянавісць да ворага, помста за кроў і слёзы народа, любоў да радзімы—вось што абумоўлівае паводзіны совецкага байца, совецкага чалавека.

Гэтымі-ж настроямі прасякнуты апавяданні трэцяй групы зборніка «Сын», «У родным горадзе», «Помста», дзе даюцца ўжо асобныя малюнкі з жыцця на вызваленай зямлі.

З вялікім хваляваннем вяртаецца чалавек на гэтую зямлю. Ён—інжынер. Нейкімі чужымі і непрыветнымі выдаюцца яму знаёмыя ад маленства мясціны. Навокал, куды ні глянеш—руіны. Сям'я інжынера жыве ў зямлянцы. Але гэта не можа зменшыць радасці і шчасця ад сустрэчы з сям'ёй, з маленькім сынам: «... чалавек ужо трымаў яго на руках, асыпаў пацалункамі і скрозь слёзы паўтараў ласкавае слова «сынок» («У родным горадзе»).

Аднак і ў сваім вялікім шчасці, якое яму прынесла вызваленне, совецкі чалавек не забываецца пра помсту лютаму ворагу.

У апавяданні «Помста» народ вуснамі дзеда Пракопа выракае свой прысуд нямецкім катам: «... нутро маё гарыць агнём пякельным і не будзе мне супакою на зямлі, пакуль на гэтай вяроўцы не павісне мой вораг!»

І, помнячы свой абавязак перад радзімай, звычайныя простыя людзі робяць вялікую справу.

Але каштоўнасць мастацкага твора вызначаецца не толькі ідэйнай накіраванасцю і матэрыялам яго. Яна вызначаецца яшчэ і тым, наколькі ярка і вобразна пададзены гэты матэрыял.

Гаворачы пра зборнік А. Якімовіча, трэба адзначыць, што апавяданні, змешчаныя ў ім, напісаны часта вельмі схематычна і публіцыстычнаю моваю. Гэта—не глыбокі разгляд рэчаіснасці, а павярхоўныя зарысоўкі. Аўтару вельмі рэдка ўдаецца знайсці характэрную рысу таго ці іншага вобраза. Так, перад намі праходзяць часамі не жывыя людзі, а схемы з рознымі імёнамі, якім аўтар даручыў выконваць у творы пэўную функцыю. У зборніку А. Якімовіча няма характараў і амаль няма жывых людзей. Больш-менш вылучаюцца як лепшыя апавяданні «Лейтэнанты», «Піонер Геня», «Помста», «Аладкі». У іх аўтар спрабуе даць некаторы псіхалагічны малюнак вобразаў. Аднак і тут штучнасць сітуацый псуе добрае ўражанне. Асабліва гэтая штучнасць выяўляецца ў апавяданні «Нямецкія цукеркі».

У дадатак да штучнасці сітуацый у апавяданнях А. Якімовіча шмат публіцыстыкі. У аўтара вельмі мала тэй маляўнічасці, таго багацця фарбаў, тае сакавітасці, якія звычайна ўласцівы мастацкаму твору. Мова пісьменніка небагатая і сухая. Прывядзем для прыкладу некалькі мейсцаў:

«Ганна вярнулася дахаты позна. Але дзеці яе яшчэ не клаліся спаць. Яны сядзелі моўчкі ў цёмнай хаце з двума замерзлымі акенцамі, напалову заткнутымі анучамі замест шыб, і насцярожана прыслухоўваліся да кожнага шоргату за дзвярыма. Дзяцей было чацвёра. Самаму большаму — Віцю ішоў дзесяты год, а самай меншай—Ядзі — чацверты. Яны былі падобны адно на другое, і на іх усіх празрыста-васковых тварыках ляжала пячаць змарнення і голаду» (апавяданне «Аладкі»).

Або яшчэ:

«Так ішлі дні за днямі. Барташэвіч усё часцей выклікаў Маню. Маня асталася сіратою. Са смерцю маткі яе болей нішто не звязвала з хатай. Яна гарэла жаданнем дзейнасці і помсты фашыстам» (апавяданне «Піонер Геня»).

Ёсць у Якімовіча і прыкрыя стылістычныя недакладнасці. Напрыклад, на пятай старонцы зборніка гаворыцца пра Міхася—лейтэнанта пяхоты: «У дарозе ён блізка сышоўся з Міхасём»... «Выходзіць, Міхась сышоўся з Міхасём (сам з сабою).

Аўтар дапускае такія сказы: «Дзеці з цікаўнасцю кінуліся да торбачкі і ўважліва ашчупалі яе», «... ніхто не тарапіў маму». «На жару сквара ўмомант нагрэлася дачырвана», «Геня выходзіў са склепа, з болем і страхам узіраўся ў ваколіцу, дзе стаяла злавеснае зарава ад бушуючых пажараў», «сказаў, што ў яе адбіты лёгкія і моцна ўдаран жывот», «разгублена глядзеў на старога з яго загадачнай вяроўкай і паранены».

Падобных прыкладаў неахайнасці ў мове і ў стылі можна-б прывесці значна больш.

Такім чынам, намеры аўтара—паказаць звычайных людзей у вялікай справе, не атрымалі ў Якімовіча належнага мастацкага вырашэння. Добрую задуму пісьменніка псуюць штучныя сітуацыі, павярхоўнасць у паказе рэчаіснасці і неахайнасць у мове. Замест мастацкіх апавяданняў пра маленькіх людзей вялікай справы чытач атрымаў невялічкія публіцыстычныя зарысоўкі.

Скульптура Пажарскага.
Работа народнага мастака БССР лаўрэата Сталінскай прэміі З. Азгура.

Трэці філіял Усесаюзнай мастацкай выстаўкі

(Ад нашага карэспандэнта)

Да дня Перамогі ў выставачным павільёне Цэнтральнага парка культуры і адпачынку (г. Масква) адчыніўся трэці філіял Усесаюзнай мастацкай выстаўкі.

Выстаўлена каля 250 твораў мастакоў Масквы, Ленінграда, Украіны, Беларусі, Грузіі, Арменіі, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Азербайджана і сярэдне-азіяцкіх рэспублік.

Народны мастак БССР З. Азгур прадстаўлены скульптурнай фігурай маршала Совецкага Саюза К. Ракасоўскага.

Заслугоўваюць увагі карціны «У няволі» Д. Цэгіна, «Кастрычнік» С. Дудніка, «Партызанскі лагер» С. Атрошчанка, «Падарункі фронту» С. Абдулаева, пейзажы М. Маторына і А. Марозава.

Прафесар Усерасійскай Акадэміі Мастацтва Р. Фрэнц пры ўдзеле мастакоў Л. Худзякова, Пэн-Вэрлена, В. Падляскага, Б. Бяляева і Н. Фірсава выканаў для выстаўкі дыяраму «Гераічная абарона Сталінграда».

Творчая камандыроўка маладых пісьменнікаў

Згодна пастановы Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР у заходнія абласці рэспублікі выехала група маладых беларускіх пісьменнікаў у складзе Івана Мележа, Анатоля Астрэйкі, Івана Грамовіча, Рыгора Няхая, Анатоля Вялюгіна і Пятра Прыходзькі.

Пісьменнікі наладзяць літаратурныя вечары ў Брэсце, Баранавічах, Гродні і іншых гарадах Беларусі, наведаюць Днепра-Бугскі канал і радзіму вялікага пісьменніка Ф. Дастаеўскага—мястэчка Дастоева.

Брыгада пісьменнікаў правядзе рад мерапрыемстваў па разгортванню літаратурнага руху на перыферыі.

Ілья Гурскі

СВАЕ ЛЮДЗІ

Урывак з п'есы, нанава пераапрацаванай

Акт трэці

Старажытны замак, пераабсталяваны пад клуб. Відаць ліпавыя алеі, малады калгасны сад. Па баках алеяў—статуі. Залатая восень, пажоўкла лісце на дрэвах. Апусцелі палі. Злева, на ўзвышшы, ля берагу рэчкі, разгарнулася праца. Ужо адна камяніца вырасла да вокнаў, відаць складзеная цэгла, узвышаюцца рыштаванні. Ідзе падрыхтоўка да пуску калгаснай электрастанцыі. На сцэне адзін Шпакоўскі, ён укручвае лямпачку. Уваходзіць Марфа.

З'ява 1

Марфа. Чу-у-ў?

Шпакоўскі. Што такое?

Марфа. Каб не Порхаўка, магло-б турбіну ўзарваць.

Шпакоўскі (важна, разважае). «Чалавек,—як кажа Доўнар,—цэлы свет». Мы лічылі Порхаўку загінуўшым, а Доўнар за яго ўзяўся і вывеў у людзі. Ён убачыў у ім чалавека, а мы гэтага не заўважалі. (Многазначна). «Каб чалавека пазнаць,—як кажа дзядзька Кажамяка,—трэба пуд солі з'есці...». (Любуецца Марфай). А ты сёння не такая як заўсёды?

Марфа (какетнічае). А якая?

Шпакоўскі. Нейкая асаблівая. (Хоча абняць).

Марфа (падняла руку). Не чапайся! Хопіць! (Хітра). Ну і Порхаўка! Цяпер за яго любая жанчына замуж пойдзе.

Шпакоўскі (насцеражыўся). Ты што гэта?

Марфа (зарагатала). Так, нічога. (Разважае). Як у жыцці бывае: учора Порхаўка нязначны чалавек, а сёння ўсе пра яго гавораць.

Шпакоўскі (рэзкая перамена). Ну, ведаеш, гэта мне не падабаецца. Падумаеш, Порхаўка!—звычайны чалавек.

Марфа (таксама мяняецца). А мне думаеш падабалася, як ты да дзяўчыны сватаўся? Дык я-ж можа маўчала. А Порхаўка такі чалавек!!

Шпакоўскі (здзіўлена). Ты яшчэ не забылася пра дзяўчыну? Калі тое было, лета прайшло...

Марфа. Жанчыны гэтага не забываюць. Стары чалавек... І няўжо ты думаў, што Наташа пойдзе за цябе?

Шпакоўскі. Пхе! Меркаваў, падсяку. (Пачынае нерваваццa). Абрыдала мне твая муштра! (Да Марфы). Лепей-бы ты мяне пабіла. Бі! (Уваходзіць Пушкарэвіч, яго не заўважаюць).

З'ява 2

Тыя-ж і Пушкарэвіч.

Пушкарэвіч (ціха). Хацеў-бы я паглядзець, як яна яго будзе калашмаціць.

Марфа. А скажы мне, каток, дзе ты ў апошні час прападаеш?

Шпакоўскі (не вытрымлівае, пачынае крычаць). Дзіва! Так я табе і сказаў! Хіба я табе муж?

Марфа. А кім-жа ты мне быў? Дзеверам? Што ты мне тады казаў, як страху крыў? Няўжо забыўся?

Шпакоўскі. Уга! Калі яно тое было. Салома на страсе даўно пагніла.

Марфа. Цяпер дык я табе нялюбай стала? Лепшую знайшоў?

Шпакоўскі (не вытрымлівае). Любай ты ніколі не была. (Крычыць). Ты ад роду Марфа!

Пушкарэвіч (сам сабе). От табе і стары, а такі прыткі да жанчын.

Марфа. А каб ты ведаў, як я цябе кахала.

(Хутка падыходзіць Порхаўка, ён у новай адзежы, паголены).

З'ява 3

Тыя-ж і Порхаўка.

Шпакоўскі (прыглядаецца). Хто гэта?

Пушкарэвіч. Порхаўка!

Шпакоўскі. Выфранціўся, як на вяселле. (Займаецца фізкультурай). Гэты не Доўнар, — Порхаўку як-небудзь убяру.

Пушкарэвіч. Што праца робіць з чалавека, яна яго ўпрыгожвае і славіць.

Порхаўка (падыйшоў). Што, яшчэ не пачыналі свята?

Пушкарэвіч. Не-е. Хіба без цябе можна? Гэта-ж трэба, нашто Кажамяка спрактыкаваны меліяратар, палажыць яго на лапаткі.

Марфа (любуецца Порхаўкам). От гэта чалавек!

Пушкарэвіч. Кажамяка асабіста спаборнічаў з Порхаўкам.

Шпакоўскі. І што?

Пушкарэвіч. У Кажамякі дзвесце трыццаць сем процантаў нормы, а ў Порхаўкі чатырыста пяць.

Марфа. Пабягу!

Пушкарэвіч. Позна. Па радыё перадалі. Лепшыя меліяратары: Порхаўка і Кажамяка; лапатнаму тэлефону няма чаго рабіць.

Марфа. Уга! Яшчэ сколькі работы. (Задаволеная). Порхаўка першы?

Порхаўка. Не буду я, калі не абганю Кажамяку па жывёлагадоўлі. Буду прасіць Доўнара, каб даверыў мне ферму ў брыгадзе Саладухі. У нас з Кажамякам свае разлікі. Разам былі навабранцамі, да аднае дзяўчыны заляцаліся. Толькі ён быў спрытнейшым лазіць цераз паркан.

Шпакоўскі (да Марфы). Што ты на яго так углядаешся?

Марфа. А на каго-ж мне глядзець, калі не на яго. (Усміхнулася). Можа «падсяку»!..

Шпакоўскі (нервуецца). Гэта-ж я магу яму рэбры падлічыць.

Пушкарэвіч (да Порхаўкі). А што было з турбінаю?

Порхаўка. Не з турбінаю, а з катлом.

Пушкарэвіч. Як-жа! Я сам чытаў у газеце.

Порхаўка (усміхнуўся). Гэта карэспандэнт, не будучы на месцы, пісаў. Быў наглуха закрыты клапан. А тут пара паднялася. І дзверы на клямцы. Я страшна спалохаўся. Ёсць, думаю, два выхады: альбо клапан адкрыць, ці мяне з катлом угару падыме; то не памятаю як я падняўся ўверх і адкрыў клапан. Зашыпела, запішчэла.... я ледзь не зваліўся адтуль. (Аглядае ўсіх). Вы часам не ведаеце, хто зачыніў дзверы на клямку?.. (Падумаў). А цяпер мяне робяць героем, няхай, ад славы галава не баліць, а толькі кружыцца.

Пушкарэвіч. А такі герой! Як там не было, а факт застаецца фактам, электрастанцыя ўратавана.

Марфа. Ха! А ўсе лічылі Порхаўку нябожчыкам. (З замілаваннем глядзіць на Порхаўку, Шпакоўскі займаецца фізкультурай).

Порхаўка (успамінае). А што вы думаеце, хацеў утапіцца. Гэта-ж не жартачкі, сцягнуць чалавека з печы. Ну, праўда, я быў п'яны, ну, ляжаў на печы. А наш старшыня калгаса Доўнар прыйшоў і сцягнуў з печы... Ідзі, кажа, гад, дзялянку церабіць... Ох, гэтая печ, шмат яна клопату людзям прынесла. Пайшоў я тады ад Кажамякі сам не свой, каля рэчкі толькі апомніўся. Сяджу на беразе, гляджу, адна калашына падкасана, другая апушчана, а ногі па калена ў вадзе. Страшна, братка, паміраць. Потым мяне павяло ў бакі, цёмна стала ў вачах, разыйшліся зялёныя кругі, я зваліўся і мусіць такі даўгавата ляжаў. А калі прышоў у сябе, дык бачу, Кажамяка на маёй дзялянцы цярэбіць кусты. Потым падыйшоў Доўнар, стаў зразаць купіны. Як узяла мяне злосць, як зашчымела сэрца, як задрыжэлі рукі. «—Вон адсюль!—крыкнуў я што было моцы. І што вы думаеце, яны такі ўважылі, пайшлі. То я і ўзяўся. Ужо і сам не рад быў, што іх прагнаў. Гарачыня. Градам льецца пот. Крывавыя мазалі на руках.—«Згары ты,—думаю,—такая праца». Да вечара ўсё-ж неяк увабраў. Прыйшоў дадому, клічуць на сход, а я не магу разагнуцца, — баліць сярэдзіна. Дай, мяркую, паляжу. Усё адно будуць выключаць, дык няхай яны за мною папабегаюць, а не я за імі. Як лёг, то на адным баку да раніцы і праспаў. А бывала ўсю ноч круцішся, як скурат на агні. І бяссонніцу маю, як рукою зняло. Выходзіць, лепшы доктар—праца. От і стаў я чалавекам. Цяпер я на свеце: і госць і гаспадар.

ПРЫЕМНЫЯ ЗМЕНЫ

(„Полымя“ №№ 1 і 2-3)

Задачы, якія паўстаюць перад нашымі пісьменнікамі і перад усім нашым большэвіцкім друкам у першай пасляваеннай пяцігодцы, сапраўды велічныя, а вялікія справы патрабуюць вялікіх думак, вялікай літаратуры.

Вось чаму было прыкра, што «Полымя»—адзіны салідны часопіс у Беларусі, адзінае перыядычнае выданне Саюза совецкіх пісьменнікаў—у мінулым годзе не адпавядаў гэтым задачам і не мог цалкам задаволіць чытача. Часам матэрыялы, якія друкаваліся на яго старонках, былі нізкай якасці і выклікалі прыкрае пачуццё крыўды.

Аднак, надыйшоў час прыемных змен. Аб гэтым сведчаць тры першыя нумары «Полымя» за 1946 год. Аб іх і ідзе размова ніжэй.

Нельга сказаць, што першы нумар «Полымя» выразна адрозніваецца ад ранейшых, але ў ім, пры наяўнасці памылак, ёсць яркія рысы таго новага кірунку, па якому часопіс павінен ісці і, відаць, пойдзе далей. Парукай таму—з'яўленне на яго старонках цікавых мастацкіх твораў, якія могуць стаць у рад з творамі лепшых рускіх совецкіх пісьменнікаў. Да такіх твораў можна аднесці вершы П. Панчанкі—таленавітыя і шчырыя, цікавыя і свежыя; апавяданне Янкі Маўра «Завошта»—бліскучае па майстэрству адлюстравання і раскрыцця глыбінь дзіцячай душы і ў некаторых адносінах аповесць М. Садковіча Е. Львова «Георгій Скарына». Толькі тры гэтыя рэчы ды можа яшчэ маленькі верш П. Пранузы «Фрыдрых II» і маюць права займаць мейсца на старонках часопіса.

Здаецца мне, што не было ніякага сэнсу змяшчаць няўдалае і зусім нецікавае апавяданне Я. Зазекі «Юркава сцежка».

Дзед Пракоп (ох, гэты бедны, заезджаны пісьменнікамі дзед!) дае свайму ўнуку Юрку паперку «для партызанскага начальніка» і хавае малога ў... печ. Вядома, у гэты час немцы заходзяць у хату і адзін з іх б'е дзеда поўху. Дзед не вытрымлівае ўдару і валіцца на падлогу. Здзекі гвалтаўнікоў абураюць яго: «За што б'ешся, пан? Дзе гэта відна, каб білі старых?..» Ад пабояў дзед памірае. Юрка выпаўзае з печы і бяжыць у лес шукаць партызанаў. Неўзабаве, як заўжды бывае ў такіх апавяданнях, партызаны самі знаходзяць Юрку. Толькі гэта зусім не партызаны, а людзі ў мядзвежых скурах (?!). Яны даганяюць Юрку і вельмі палохаюць беднага хлопчыка. А потым мядзведзі пачынаюць размаўляць. Аказваецца, партызаны пераапрануліся для таго, каб... захаваць сакрэт. Ну, вядома, Юрку прыводзяць, ён аддае «самаму галоўнаму партызанскаму начальніку» дзедаву паперку. А раніцой партызаны налятаюць на немцаў, знішчаюць іх. На гэтым абрываецца Юркава сцежка, па якой яго так неразумна і няўмела правёў лёгкай рукой аўтар.

Вершы В. Матэвушава, А. Бачылы і М. Гамолкі асаблівай увагі па сваіх якасцях не заслугоўваюць. Да таго-ж, хочацца папракнуць рэдакцыю часопіса за тое, што яна не заўважыла істотных памылак і апрача таго сама дапусціла некалькі друкарскіх памылак.

Але адразу-ж адчуваеш нейкую душэўную асалоду, калі пераходзіш да чарговых—другога-трэцяга нумароў, з'еднаных у адну кнігу. Напэўна, рэдакцыя паставілася да адбору матэрыяла для гэтых нумароў больш сур'ёзна, прынцыпова.

У гэтых двух нумарах апублікаваны цікавыя матэрыялы. Кнігу адкрывае гістарычная прамова вялікага Сталіна перад выбаршчыкамі Сталінскай выбарчай акругі горада Масквы. Кароткія нарысы М. Лынькова пра П. К. Панамарэнку і П. Броўкі пра Якуба Коласа знаёмяць чытача з жыццём і дзейнасцю гэтых выдатных змагароў за шчасце беларускага народа, пачэсных сярод пачэсных беларускіх дзеячоў. Мастацкія творы і свежыя па думцы і абгрунтаванню крытычныя артыкулы Ц. Крыськo і Ул. Карпава проста радуюць чытача сваім з'яўленнем.

У гэтых нумарах надрукаваны працяг аповесці «Георгій Скарына»—некалькі раздзелаў, якія даводзяць чытача да таго часу, калі Скарына паступае вучыцца ў Кракаўскі універсітэт і знаёміцца з Капернікам. Я мяркую, што пра аповесць будзе напісаны артыкул тады, калі яна будзе апублікавана цалкам, хачу толькі сказаць, што аповесць абяцае быць досыць цікавай, як кажуць, чытабельнай. Перад вачыма ў яркіх малюнках паўстае старажытная Беларусь з яе эканамічным і палітычным укладам.

Звяртае ўвагу і п'еса В. Вольскага «Машэка».

Ставячы сабе за мэту — намаляваць карціну жыцця і змагання беларускага народа ў даўнія часы, В. Вольскі стварыў удалыя тыповыя вобразы. Асноўны герой п'есы Машэка—гэта вобраз, які ўвасабляе рашучасць, смеласць, сілу і магутнасць народа. Другарадныя героі намаляваны таксама сакавіта і выразна. Падзеі хаця некалькі і рамантычныя, але гістарычна цікавыя. Характэрна, што нават у абмалёўцы адмоўных персанажаў п'есы (князь) пісьменнік пазбегнуў абрыдлай крайнасці—маляваць адмоўнае толькі чорнымі фарбамі. Яго князь—жывы чалавек, ён не пазбаўлены пачуцця гонару, хаця пачуццё гэтае ў ім няўстойлівае. Падзеі разгортваюцца з маланкавай хуткасцю і трымаюць увагу чытача ўвесь час у напружанні. І мне здаецца, што калі апусціцца апошні раз заслона, глядач яшчэ шмат хвілін будзе жыць пад уражаннем толькі што бачаных падзей. І таму нельга прабачыць аўтару некаторыя хібы яго твору.

Па-першае, мне здаецца, што вобраз бацькі Ганкі Рабіны аўтарам недамаляваны. Часам у гэтым, па ходу п'есы, станоўчым вобразе, мы заўважаем яркавыражаныя адмоўныя рысы. Возьмем, напрыклад, той момант, калі дружыннікі князя хапаюць Ганку. Рабіна заступаецца і кляне старэйшага дружынніка:

«—Каб вас зямля не насіла... Каб вы прахам пайшлі, зладзеі...»

Гэта праўдзіва выказвае ўсю глыбіню гневу Рабіны. Але пасля таго, як дружыннік б'е самаго Рабіну, ён не знаходзіць нічога лепшага, як:

— «Каб на цябе чатыры дошкі і зямлі трошкі...»

У такім супастаўленні гэта гучыць як просты, нязлосны жарт.

І далей, Рабіна, які адмаўляецца ад дачкі ў князевым палацы, пасля пакарання князя робіцца абаронцам яе перад Машэкай. Відавочная няўстойлівасць характару, што ні па задуме аўтара, ні тым больш па ходу сваіх падзей, яму не ўласціва.

І, нарэшце, пры вельмі аддаленым часе дзеяння, які вядзе нас да часоў мечаў і стрэл, калі самы звычайны дручок у моцных руках быў яшчэ вельмі грознай зброяй, падзеі ў п'есе адбываюцца так, як яны маглі-б адбывацца ў наш век—век машын і метала. Шчыра кажучы, гэтае «асучасванне» ўжо даволі надакучыла і нашаму чытачу, і нашаму гледачу.

У нізцы вершаў М. Лужаніна ёсць некалькі цікавых, арыгінальных вершаў. У новых вершах паэт як-бы падагульвае цяжкі шлях барацьбы і пакут і кідае позірк у светлую будучыню. Лепшы верш з надрукаванай нізкі—«Вільнянка». Многія вобразы, створаныя М. Лужаніным, запамінаюцца адразу:

А дым стаяў, як чэмер, горак,
І прыгарэньваўся прастор,
Калі на сіні панадворак
Выносіў вечар сіта зор.
Іх не маглі скляваць зяніткі
Даўгімі дзюбамі за ноч,
І абабраныя да ніткі,
Бярозы стыглі басанож.

Вось і ўсё аб матэрыялах, апублікаваных у першых трох нумарах часопіса «Полымя» за 1946 год. Усе недахопы ляжаць больш на сумленні саміх аўтараў, чым на сумленні рэдакцыі. І мне здаецца, што калектыву рэдакцыі мы павінны пажадаць шчаслівай дарогі, па якой яна ўжо накіравала свае крокі да выканання пачэснай задачы — павышэння мастацкай якасці часопісу.

К. ЦІТОЎ.

Шэкспіраўская канферэнцыя

У пачатку мая ў Маскве адбылася чарговая шэкспіраўская канферэнцыя, прысвечаная 330 гадавіне з дня смерці Вільяма Шэкспіра.

Даклад на тэму «Шэкспір на совецкай сцэне» зрабіў прафесар М. Марозаў.

— Творы Шэкспіра,—адзначыў дакладчык,—перакладзены на 27 моў народаў Совецкага Саюза. У 1941 годзе шэкспіраўскія спектаклі ішлі адначасова ў 210 тэатрах нашай краіны.

З дакладамі выступілі дацэнт Маскоўскага універсітэта Л. Пінскі на тэму «Трагічнае ў творчасці Шэкспіра» і С. Крыжаноўскі «Камічнае ў творчасці Шэкспіра».

У канферэнцыі прымалі ўдзел рэжысёры, акторы, пісьменнікі, крытыкі, мастацтвазнаўцы і студэнты тэатральных інстытутаў.

Вокладка новай кнігі Якуба Коласа «Паэмы».

У абласных тэатрах

„ЛІСІЧКІ“ Ў БАБРУЙСКІМ ТЭАТРЫ

Пачатак першага акта п'есы Ліліан Хэлман «Лісічкі» ў Бабруйскім тэатры мы глядзелі без асаблівай цікавасці. Але вось—канец акта, другі акт, і мы заўважылі тут нешта новае. Гэта новае заключаецца ў гострым сатырычным раскрыцці сутнасці драпежнікаў. За моднымі фракамі, асляпляльнымі белымі манішкамі і манжэтамі раптам адкрываецца чорнае звярынае нутро прадпрыемцаў-уласнікаў.

І мы ўбачылі, што ўсе яны далёка не «лісічкі», як гэта пададзена ў п'есе, а хутчэй ваўкі, якія сквапна выдзіраюць адзін у другога здабычу, або чакаюць зручнага моманту, каб затым накінуцца на яго ўсёй зграяй і зжэрці.

Вось гэта гострае выкрыццё драпежнікаў, якія прыкрываюцца авечай скурай, паказ цынізму, грубасці і прасталінейнасці абмежаваных людзей, якія імкнуцца толькі да адной мэты — нажывы, і робіць спектакль новым.

Рэжысёр Бабруйскага тэатра М. Кавязін прачытаў і паставіў п'есу арыгінальна, па-свойму.

Адной з удач рэжысёра з'яўляецца ўмелае раскрыццё падтэксту ў паводзінах і словах дзейных асоб і тонкае выкрыццё іх двудушнасці. У спектаклі правільна пастаўлены сэнсавыя акцэнты.

Вельмі моцна праводзіцца канец другога акта, калі Гарацый адмаўляецца даць грошы. Тут упершыню найбольш ярка агаляюцца і груба сутыкаюцца інтарэсы драпежнікаў.

Некаторыя мейсцы ў спектаклі, безумоўна, патрабуюць выпраўлення або удасканалення.

Занадта шмат у спектаклі музыкі. І таму часта музыка не толькі не дапамагае, але перашкаджае ўспрыймаць драматычныя сцэны.

У пачатку другога акта ў сцэне чакання прыезду хворага Гарацыя, ад якога ўсе разлічваюць атрымаць грошы, яшчэ не знойдзена атмасфера напружанага чакання.

Агульнаму плану спектакля падпарадкавана вырашэнне і ўсіх вобразаў. У вобразе Рэджыны найбольш сканцэнтраваны якасці драпежніка, які не пагарджае ніякімі сродкамі для дасягнення мэты.

Артыстка Н. Вінтоўкіна здолела ўлавіць гэты асноўны змест вобраза. За знешне прыемным вобразам Рэджыны ўвесь час адчуваецца драпежніца, і гэта выклікае ў гледача агіду не толькі да яе, але і да ўсіх тых, хто разумеецца пад гэтым вобразам.

Зазначым, аднак, што ў другім акце, калі арт. Н. Вінтоўкіна іграе Рэджыну Лісічку ў адносінах да мужа-Гарацыя, губляецца адчуванне двайной ігры і яе тлумачэнні гучаць як шчырыя. Гэта ўводзіць гледача ў зман, бо з шчырасцю Рэджына незнаёмая.

У спектаклі мы бачым вобраз «прадпрыемцы» Бэна (арт. Зубакоў), які надзелены арыгінальнымі ўнутранымі і знешнімі якасцямі. Гэта чалавек разумны для сябе, іншы раз мяккі, іншы—грубы, але заўсёды насцярожаны, які ўвесь час цікуе за здабычай і кожны момант гатовы скочыць, каб схапіць яе.

Таксама цікавы і арыгінальны вобраз Аскара. Але часамі актор В. Гуняжэнка выпадае з правільна вызначанага вобраза і раптам паўстае чалавекам з другімі якасцямі.

З усіх ролей, сыграных маладым акторам Е. Зубоўскім у гэтым тэатры, роля Лео яму найбольш удалася. Яго Лео—разбэшчаны, злачынны малады чалавек, вельмі падыходзіць да ўсёй гэтай кампаніі.

Безумоўна, лепшы вобраз ува ўсім спектаклі—Бердзі (арт. Халіна). Бердзі—прадстаўніца старога арыстакратычнага роду Паўднёвай Амерыкі. Яна ніяк не можа прымірыцца з тым, што маёнтак, дзе некалі жылі яе бацькі і яна сама, скарыстаны яе мужам Аскарам у гандлёвых інтарэсах. Яна—няшчасная, самотная, спустошаная жанчына, што жыве толькі ўспамінамі аб мінулым.

Дачка Рэджыны—Аляксандра з'яўляецца прадстаўніцай светлага, новага будучага. Яна парывае з сям'ёй і імкнецца будаваць жыццё па-свойму. Артыстка Пятрова пераканаўча перадае якасці і пачуцці наіўнай 16-гадовай дзяўчыны, якая дрэнна разумее жыццё. Але вось Аляксандра сутыкаецца з жорсткай рэчаіснасцю. Яна падазрае Рэджыну ў забойстве бацькі. У яе выспявае пратэст, які прыводзіць да пералому ў характары. Тут артыстка пераігрывае. Яна настолькі змяняе вобраз, робіць Аляксандру іншай, дарослай, але такой надламанай і пакалечанай, што цяжка паверыць у яе здольнасці пабудаваць жыццё па-новаму.

Актор Шышалёў добра перадае ўнутранае жыццё Гарацыя, чалавека фізічна хворага, але здаровага маральна—сумленнага і гуманнага. Таксама пераканаўчая ігра актора Анісімава ў ролі прамыслоўца з Паўночнай Амерыкі—Мэршала.

Хаця дзеянне ў п'есе адбываецца амаль палову стагоддзя таму назад, спектакль гучыць актуальна.

У пастаноўцы паказаны адваротны бок хвалёнай «прыватнай ініцыятывы» ў буржуазных краінах, паказана, як гэтая прыватная ініцыятыва разбэшчвае людзей, робіць іх злачынцамі.

Спектакль «Лісічкі» ў Бабруйскім тэатры з'яўляецца каштоўным творам як у мастацкіх, так і ў ідэйных адносінах. Ён праўдзіва апавядае аб жыцці ў сучасным буржуазным грамадстве і гэтым выхоўвае ў нашых гледачоў любоў да совецкай радзімы.

Ул. НЯФЕД.

Заўвагі да новых спектакляў Палескага тэатра

(Замест рэцэнзіі)

Рэпертуар Пінскага Абласнога драматычнага тэатра ў 1946 г. папоўніўся трыма новымі спектаклямі: «Вясельнае падарожжа» (пастаноўка А. Дашкоўскага), «Раскінулася мора шырока» (рэжысёр Паскевіч) і «Любоў Яравая» (пастаноўка мастацкага кіраўніка тэатра А. Віленскага). Нельга праводзіць аніякай аналогіі паміж гэтымі спектаклямі з пункту гледжання зместу апошніх, але іх еднае выканаўчая культура маладых артыстаў, якія праявілі тут значныя поспехі.

Прыемнае ўражанне пакідае спектакль «Вясельнае падарожжа». І гэта тым больш радасна, што ён створаны сіламі маладых актораў тэатра: Яворскі (Косцік), У. Палц'еўскі (Андруша), Цурбакоў (Марк), А. Якуцік (прафесар Сінільнікаў), Зяленка (Зоя), Ротэр (Насценька). Сумленная праца пастаноўшчыка адчуваецца тут у кожнай дэталі і кожнай масавай сцэне.

Спектакль карыстаецца поспехам. Гэтая лірычная камедыя глядзіцца лёгка. Цэнтральнае мейсца тут займае тэма сяброўства, кахання і грамадскага абавязку совецкай моладзі перад радзімай.

Аднак, у пастаноўцы ёсць і хібы. Гэта—перш за ўсё трэба сказаць пра ролю прафесара Сінільнікава, учынкі якога ніяк не адпавядаюць паводзінам навуковага супрацоўніка.

У мастацкім афармленні пакоя маскоўскай гасцініцы, дзе павінна была-б адчувацца рабочая абстаноўка габінета, занадта стракатыя фарбы ствараюць уяўленне аб нейкім пакоі адпачынку.

Спектакль «Раскінулася мора шырока» не аб'еднаны адзінай думкай пастаноўшчыка, а складаецца з паасобных эпізодаў. Асабліва кідаецца ў вочы бездапаможнасць рэжысёра ў працы з актарамі, таму асобныя сцэны атрымаліся нежыццёвымі і штучнымі (напрыклад, сцэна, калі Алена — Гальперына знаходзіцца ў нямецкім штабе). Гэтай-жа артыстцы, якая зусім не валодае музычнымі здольнасцямі, даручылі выконваць рад вакальна-сольных нумароў. У трактоўцы вобраза пераважае сантыментальнасць, а тыповыя рысы совецкай дзяўчыны—патрыятызм, мужнасць, энергічнасць, сіла волі—паказаны невыразна і непераканаўча.

Нават такому здольнаму актору, як Яворскі (капітан фон-Дытмарштэйн), рэжысёр не дапамог стварыць вобраза, які хацеў-б трохі адпавядаў жыццёвай праўдзе, бо цяпер ён нават па ўзросту не адпавядае сваёй ролі.

Каханне Кедрава (арт. Падляхоўскі) і Алены не праходзіць праз увесь спектакль і пакідае гледача ў непаразуменні.

Музычнае афармленне Галіна зроблена з паасобных аперэтачных урыўкаў і зусім не звязана з сюжэтам спектакля, у той час, як музыка ў спектаклі займае значнае мейсца. Да таго-ж і выкананне аркестра не зусім добрае.

Асноўная тэма спектакля «Любоў Яравая» К. Трэнёва—гэта барацьба за стварэнне маладой совецкай дзяржавы пасля Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Для нашага гледача гэтая п'еса цяпер асабліва блізкая таму, што мы зусім нядаўна перажылі гістарычныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, якія шмат у чым пераклікаюцца з падзеямі нашага рэволюцыйнага мінулага.

Перш за ўсё хочацца станоўча ацаніць ігру арт. Цурбакова, які правільна зразумеў вобраз паручыка Яравога і здолеў раскрыць перад гледачом гэты своеасаблівы характар, а таксама ігру арт. Яворскага ў ролі Чыра.

Любоў Яравая ў выкананні арт. Л. Цімафеевай — досыць яркі вобраз. Праўда, мастацкую вартасць вобраза зніжае некаторая празмерная сантыментальнасць, што асабліва прыкметна ў сцэнах з Паповай (арт. Гальперына).

Не зусім добрае ўражанне пакідае Кошкін-Палц'еўскі. Артыст не здолеў стварыць вобраз совецкага працаўніка, поўнага энергіі і волі.

Аднак, бясспрэчна, спектакль з'яўляецца дасягненнем маладога здольнага калектыва. Шлях, які пачынаецца са спектакля «Любоў Яравая», з'яўляецца правільным. Толькі на такіх спектаклях можа расці і выхоўвацца калектыў тэатра.

Н. ТАМАШОВА.

К. Губарэвіч

ТЭМЫ СТАЛІНСКАЙ ПЯЦІГОДКІ

У нашай літаратуры ёсць шмат непачатых тэм, нягледзячы на тое, што на некаторыя з іх напісана ўжо нямала твораў.

У першую чаргу тут маем на ўвазе, бадай, манапольную ў сённешняй прозе, тэму дэмабілізаванага воіна.

Ніхто, зразумела, не будзе адмаўляць права гэтай тэмы заняць у літаратуры заслужанае і пачэснае мейсца. Але яна заслугоўвае больш таго, чым зроблена нашымі пісьменнікамі да гэтага часу, хоць аб дэмабілізаваным воіну напісана ўжо даволі шмат.

Тым не меней даводзіцца канстатаваць, што амаль усё напісанае мае вельмі далёкае дачыненне да сутнасці самой тэмы.

Многіх аўтараў спакушае радасць першай сустрэчы салдата са сваёй радзімай і роднымі. Да гэтага хвалюючага моманту спяшаецца салдат, а разам з ім і аўтар. І ў спешцы аўтар часам не заўважае, што ён вядзе свайго салдата нават не па сцежцы, а па шырокаму ўжо літаратурнаму тракту, па якім ідуць дамоў у апавяданнях усе дэмабілізаваныя воіны.

Салдат едзе ў цягніку, выходзіць (ці саскаквае на хаду з падножкі вагона) на сваёй станцыі, або раз'ездзе, яго падвозяць дамоў (ці ён ідзе пешшу), па дарозе ён успамінае даваенныя пейзажы родных мясцін (гама пачуццяў і настрояў). У адным і тым-жа цягніку, адной і той-жа дарогай едуць і ідуць дадому дэмабілізаваныя воіны-героі апавяданняў А. Кулакоўскага («Мікіта Мінавіч», «Мой сын»), М. Лобана («Дачка»), А. Якімовіча («Сустрэча»), А. Алешкі («Журба і Монцік»), І. Гурскага («На родных гонях»), Я. Маўра («На парозе будучыні»).

Усе яны аднолькава хвалююцца, аднолькава думаюць аб сустрэчы і чамусьці менш за ўсё—аб будучым жыцці. І толькі, завёзшы воіна дамоў, некаторыя аўтары дазваляюць сабе адзін з многіх варыянтаў адступлення. У адных творах салдат нічога не знаходзіць, у другіх яго сустракае жонка з дзецьмі, або маці, у трэціх—толькі маці ці бацька.

Радасцю ці горам першай сустрэчы фактычна і заканчваюцца гэтыя творы.

Ну, а далей?

Тэма дэмабілізаванага воіна, па сутнасці, пачынаецца пасля першай сустрэчы, калі ён асвойтаецца і пачынае новае жыццё. Усё, што было і магло быць да гэтага, з'яўляецца толькі прадмовай да тэмы, подступам да яе, які, да рэчы, не абавязкова пераадольваць у кожным творы, а можа лепш абыйсці, каб не паўтараць ужо напісанае. А самае важнае для пісьменніка пачынаецца іменна далей, пасля прадмовы да тэмы, бо ў распараджэнне аўтара паступаюць, гэтак кажучы, новыя і незвычайныя людзі, якіх менш за ўсё можна раскрыць і паказаць у першых сустрэчах.

Справа ў тым, што гэтыя людзі, пасля чатырох год вайны і разлукі, прыходзяць дамоў далёка не тымі, якімі яны пайшлі на фронт, і сустракаюць яны сёння далёка не тых бацькоў, жонак, блізкіх, з якімі яны развіталіся чатыры гады назад.

Былыя трактарысты, брыгадзіры, звеннявыя, рахункаводы, слесары, механікі, сёння вярнуліся лейтэнантамі, капітанамі, маёрамі з шматлікімі баявымі заслугамі і ўзнагародамі. Як такі чалавек возьмецца за мірную, можа ўжо і не такую «ганаровую» працу? Як гэтыя людзі перажываюць псіхалагічны паварот ад баявога да мірнага жыцця? З якімі думкамі і планамі вярнуліся яны дамоў: ці змагацца за даваенны ўзровень жыцця, ці пераўзыйсці яго найхутчэй і выйсці на прасторы новай пяцігодкі? Як складаецца асабістае жыццё былых воінаў у цяжкіх пасляваенных умовах?

Ды ці мала падобных пытанняў паўстае перад пісьменнікам, калі ён сурёзна падыйдзе да гэтай тэмы! І кожнае з іх—невычарпальная крыніца цікавых сюжэтных калізій, творчых адкрыццяў і знаходак, якіх яшчэ так мала ў сённешняй беларускай прозе. І асабліва мала арыгінальных і свежых сюжэтаў.

Цікавы сюжэт не можа з'явіцца сам па сабе. Арыгінальны сюжэт—вынік глыбокага і своеасаблівага вырашэння тэмы.

Зразумела, што на фатаграфічным апісанні прыезду ці прыходу воіна дамоў нельга было стварыць цікавы, свежы сюжэт. Але ён з'явіцца абавязкова, калі пісьменнік увойдзе ўглыб тэмы, а не будзе блукаць вакол яе. Да таго-ж аўтары яшчэ не заўважаюць, што сёння пачуцці першых сустрэч ужо амаль утаймаваліся, і былыя воіны ўзяліся за працу па аднаўленню жыцця сваёй радзімы і свайго ўласнага.

І вось, паказаць былых воінаў на гэтай працы, знайсці новае не толькі ў новаадбудаваных хатах, вёсках і заводах, а і ў думках, пачуццях і характарах людзей, у іх сённешніх узаемаадносінах—самае галоўнае для пісьменніка, які піша на гэтую тэму.

* * *

Ёсць яшчэ адна тэма ў нашай літаратуры, якая пакуль застаецца па-за ўвагай беларускіх празаікаў.

Гэта тэма новай сталінскай пяцігодкі.

Калі аб дэмабілізаваным воіну напісана ўжо столькі, што можна і трэба ўжо гаварыць аб станаўленні нейкага творчага штампа, дык на гэтую тэму, бадай, нічога яшчэ не напісана, калі не лічыць асобныя выпадковыя і не зусім удалыя спробы.

Ставячы так пытанне, можна чакаць даўно вядомы папрок, што мастацкі твор—не газета, і газетная аператыўнасць пісьменніка не заўсёды ідзе на карысць літаратуры, тым больш, што закон аб сталінскай пяцігодцы зацверджаны быў не так ужо і даўно, каб пісьменнік здолеў творча асэнсаваць яго. Гэта правільна, як і правільна тое, што чацвертая сталінская пяцігодка, як і ўсе наступныя, будзе, бадай, самай кардынальнай тэмай у совецкай літаратуры і мастацтве на доўгія гады. Але справа не ў датах. Аб новай пяцігодцы можна было пісаць ужо з першых дзён вызвалення Беларусі. З таго часу амаль прайшло ўжо два гады. За два гады наша краіна далёка пайшла наперад, але гэта і не знайшло яшчэ вартага ўвасаблення ў творах. Ці не занадта ўжо марудна пісьменнікі разварушваюцца? Ці абавязкова адразу брацца за вялікае эпічнае палатно, каб у адным творы і адразу паказаць веліч станаўлення? Зусім не. Цяпер дарэчы і зусім слушна пастаўлена пытанне аб мастацкім нарысе. Гэты занядбаны пісьменнікамі жанр павінен заняць і зойме ў бліжэйшым будучым вялікае і пачэснае мейсца ў літаратуры. Няма ніякіх падстаў пагарджаць ім і сароміцца яго. Не сорамна-ж было Кузьму Чорнаму і Міхасю Лынькову напісаць рад цікавых і значных па сваіх літаратурных якасцях нарысаў пра людзей і справы Вялікай Айчыннай вайны, нарысаў, якія і сёння стаяць вышэй шмат якіх твораў пра Айчынную вайну, напісаных у «чыстым» жанры апавядання ці навелы. Чаму-ж і сёння нашым пісьменнікам не паспрабаваць сябе ў гэтым жанры? Сам характар работы над нарысам прымушае пісьменніка шчыльна падыйсці да людзей, да жыцця, навучае бачыць і вывучаць яго супярэчнасці і героіку.

А як часта не хапае ў некаторых мастацкіх творах ведання сённешняга простага і ў той-жа час складанага жыцця.

У бліжэйшым з нумароў «Полымя» друкуецца аповесць У. Краўчанкі «Станаўленне». Гэта першая спроба аўтара выкарыстаць свае сілы ў буйным жанры і разам з тым першая спроба ў беларускай прозе ў вялікім жанры закрануць тэму пасляваеннага станаўлення жыцця і людзей. Не даючы ацэнкі аповесці, можна толькі сказаць, што аўтару яна ўдалася. Ужо адна спроба ўзяцца за тэму пасляваеннай асушкі балот і станаўлення чалавечага жыцця, заслугоўвае самай сурёзнай увагі. Тым болей, што аўтару, з пачатку да канца, праз вобраз Міколы Чайкіна ўдалося правесці цікавую ідэю. Праца і толькі праца здольна была загаіць яго глыбокую душэўную рану, нанесеную фашыстамі, якія пагналі на катаргу і загубілі яго жонку Валю.

Але калі ўжо гаварыць аб працы, якая вылечыла Міколу Чайкіна, дык нельга не папракнуць аўтара ў павярхоўнасці асобных мейсц аповесці, асабліва тых, дзе паказана гэтая праца. Асушка балот у пасляваенных умовах—рэч складаная і далёка нялёгкая. Цяжкасцей тут, як і ва ўсіх вялікіх пачынаннях, шмат. Воля людзей выяўляецца і гартуецца іменна на пераадоленні гэтых цяжкасцей. У Чайкіна-ж ідзе ўсё даволі лёгка і гладка. Досыць лёгка ён арганізаваў людзей для асушкі балота, сабраў патрэбны інвентар, і рушыў у пераможнае наступленне на Пагіблыя. Справа тут не ў смакаванні нашых пасляваенных цяжкасцей, гэтага якраз і не трэба, а справа ў тым, што нельга ў мастацкім творы баяцца жыццёвых супярэчнасцей, бо ў рэшце рэшт совецкія людзі вучацца на іх, перамагаюць іх і ў гэтай перамозе мацнеюць і гартуюцца.

Перад Чайкіным, бадай, няма такіх супярэчнасцей і іх няма толькі таму, што тыя рэальныя ўмовы, у якія аўтар паставіў свайго героя, не вельмі глыбока былі вывучаны самім пісьменнікам, і ён узяў для аповесці толькі іх знешнюю фактуру.

Гэта акалічнасць лішні раз падкрэслівае, якое вялікае значэнне мае для пісьменніка глыбокае разуменне жыццёвых абставін, у якіх дзейнічаюць яго героі. Толькі ў рэальных умовах жыцця можа развівацца і бытаваць мастацкі вобраз, а значыць,—можа быць вырашана тэма.

„ЗАПРАЦАВАНЫ ХЛЕБ“

(Новы спектакль у драматычным тэатры імя Янкі Купалы)

П'еса А. Н. Астроўскага «Запрацаваны хлеб», напісаная драматургам у 1874 годзе і ў тым-жа годзе паставленая на сцэне Малога тэатра, поспеху не мела, нягледзячы на тое, што асноўныя ролі выконвалі такія выдатныя акторы, як Шумскі (Карпелаў), Нікуліна (Жэня) і іншыя. П'еса не вытрымала нават аднаго сезона. Яна была зноў прынята да пастаноўкі толькі праз 40 год — у сезон 1914—15 гг. Наогул, п'еса была «няходкай». Прычыны гэтага заключаюцца хутчэй за ўсё ў тым, што гэта была не першая і не лепшая рэч, напісаная Астроўскім на падобную тэму. І па характару сюжэтнай пабудовы, і па абмалёўцы вобразаў, і па вырашэнню тэмы—«Запрацаваны хлеб» набліжаецца да «Позняга кахання» і іншых, так званых «ціхіх» п'ес Астроўскага — «Выхаванка», «Апошняя ахвяра» і да т. п.

Здавалася-б, вельмі рызыкоўна (у сэнсе поспеху) ставіць яе ў тэатры, які мае ўжо ў сваім рэпертуары «Позняе каханне», да рэчы, з вельмі моцным выканаўчым складам, у той час, як у «Запрацаваным хлебе» іграюць акторы, калі і не ўсе маладыя ў сэнсе работы на сцэне, дык маладыя творча, якіх на працягу доўгага часу не былі заняты ў больш-менш значных ролях. І сапраўды, творчая бяздзейнасць пакінула свае адзнакі на рабоце такіх актораў, як Хацкевіч і Ліцкая. Апошняя асабліва часта карыстаецца штампамі замест таго, каб увайсці ў вобраз, бо самы працэс сапраўднай акторскай работы над роллю ёю ўжо забыты за доўгі час вымушанай бяздзейнасці. І папракаць у гэтым артыстку нельга. Тут—віна тэатра, і спектакль, што створаны сіламі актораў, якіх мы даўно ці зусім яшчэ не бачылі ў колькі-небудзь значнай ролі, з'яўляецца прыемным сведчаннем таго, што нездаровыя традыцыі ў тэатры пераадольваюцца. У гэтым — вялікая заслуга рэжысёра спектакля Л. Літвінава. У выніку яго ўпартай і настойлівай працы з'явіўся гэты спектакль, які, можна проста сказаць, пераўзышоў нашы чаканні. Перад гледачом раптам адкрыліся нікім раней не заўважаныя магчымасці рада актораў, якія яшчэ ўчора былі непрыкметнымі.

І таму больш за ўсё хочацца тут гаварыць аб акторах.

Цэнтральную ролю п'есы Карпелава выконвае артыст А. Бараноўскі. З выключнай цеплынёй стварае актор вобраз старога настаўніка, сціплага, крыху дзівака, педанта, але гуманнага і сумленнага чалавека з вялікай душой і палымяным сэрцам. У самых цяжкіх абставінах жыцця Карпелаў-Бараноўскі не губляе надзеі, не пакідае любіць жыццё ва ўсіх яго праявах. Ён вялікі аптыміст, і гэта збліжае вобраз, створаны акторам, з вобразам горкаўскага Перчыхіна (асабліва гэта адчуваецца ў 4 акце, калі гучыць заключны маналог Карпелава, поўны веры ў жыццё).

Добра тое, што актор заўсёды імкнецца ісці ад унутранай характарыстыкі вобраза. Глядач не адрывае вачэй ад Карпелава-Бараноўскага ад першага яго з'яўлення на сцэне. Нельга забыць яго ігру ў сцэне, што пачынаецца словамі: «Я вярну гэтыя грошы, вярну... Прадам... Палітончык прадам...» Але часам Бараноўскі, павярхоўна наслядуючы манеры ігры Г. Глебава, ганяецца за эфектным гэстам, за асобнай дэталлю, і парушае ўражанне ад вобраза, вельмі марудным падыходам да гэтай дэталі. Асабліва гэта бачна ў сцэне перад рэплікай: «Ты—азінус». Дарэчы, і дэталь, да якой падводзіць Бараноўскі гледача, зусім не арыгінальная.

Маладая артыстка М. Мірончык (Наташа) вельмі прыемна ўражае тым-жа імкненнем да жыццёвай праўды. Амаль не валодаючы акторскай тэхнікай, часта бездапаможная ў рухах, застыглая ў міміцы, яна шчырасцю свайго пачуцця ў моцных мейсцах п'есы хвалюе гледача. Але ў «невыйгрышных» мейсцах яна застаецца шэрай і звычайнай.

Змагацца з гэтым недахопам трэба асцярожна, бо нам ужо два разы давялося быць сведкамі зрываў у бок найгрыша, якія з'яўляюцца вынікам непасільных намаганняў артысткі выйсці з шэрасці. Як прыклад, можна прывесці выдатнае мейсца ў маналозе 4-га акта «Ды не нарадзілася я разлучніцай». Гэтыя словы асабліва выразна раскрываюць характар Наташы—яе чыстату, гуманнасць, высокую інтэлігентнасць душы з адначаснай пакорлівасцю лёсу. І вось гэтае мейсца, у якім Мірончык часамі ўзрушвае гледача шчырасцю пачуцця, іншы раз тучыць невыразна таму, што артыстцы не хапае тэмперамента весці ўвесь маналог у высокім напружанні.

Зусім іншая ігра арт. Б. Дакальскай (Жэня). Артыстка не імкнецца жыць у вобразе, а ідзе па лініі знешняга паказу. Але тут яна бездапаможная, бо пакуль не валодае ўменнем выдаваць знешняе праяўленне пачуцця за самае пачуццё. Таму ўсё, што яна робіць на сцэне, непераканаўча. Да таго-ж Жэня ў яе атрымоўваецца дваістай: з аднаго боку, гэта—надзвычай наіўная простая дзяўчына, з другога—спрактыкаваная какетка.

Цікава іграе ролю купца-дамаўласніка Чапурына актор С. Хацкевіч. Імкненне актора ўбачыць і выявіць дзве душы гэтага вобраза—сквапнасць купца, што лічыць кожную капейку, і сапраўдную гуманнасць чалавека, які здольны глыбока адчуваць чужое гора,—дало свае дадатныя вынікі. Добра, што актор пазбегнуў сусальнасці ў абмалёўцы такога «дабрачыннага» купца. Ігра яго вытрымана ў сціплым і строгім знешнім рысунку. Хацелася-б толькі трошкі больш «чалавечнасці» і ў знешнім выглядзе, бо грым неяк не зусім стасуецца да ўнутранай сутнасці вобраза. Залішняя стрыманасць (калі не сказаць—скутасць) рухаў, аднастайнасць поз таксама крыху шкодзяць агульнаму ўражанню ад ролі.

Некалькі больш раскрываецца актор ў рэпліцы: «Што я за катаржнік такі...». Тут без меладраматычных адценняў гучыць усхвалёваны голас, у якім чуваць вялікая, але ўсё яшчэ стрыманая апошнімі намаганнямі волі сіла шчырага пачуцця. І гэты пакутлівы выраз вачэй гаворыць нам больш, чым нават словы. Але занадта ўжо хутка, непераканаўча хутка (праз адну толькі кароткую рэпліку Наташы) актор пераходзіць ад стану такога высокага душэўнага напружання да злоснага тону: «А вы ведаеце, якую цяпер штуку Капроў задумаў?»

Вельмі непасрэдна і лёгка адчувае сябе артыстка М. Троіцкая ў ролі Маланні, бо гэта—«яе роля». Кожнае з'яўленне артысткі на сцэне выклікае пэўную разрадку ў залі. Выдатна праведзены ёю 4-ты акт. Артыстка іграе гостра, нават гранічна гостра, так, што здаецца, вось-вось пойдзе ў найгрыш. Таму Троіцкай трэба заўсёды кантраляваць сябе.

Артыстка добра знайшла ў фінале адчуванні Маланні на агульным фоне радасці. Малання плача. Ёй шкада і паненкі, што неяк «не па-людску» выходзіць замуж у дзень смерці каханага чалавека, які да таго-ж «такі шчодры! Такі пан!» Затым ведае, што ад прыжымістага Чапурына не пажывіцца, ды і наогул гаспадаранне яе ў гэтым доме відавочна канчаецца. Вось чаму яна і плача.

Вельмі агульны Б. Уладамірскі (Капроў). Штампованыя позы, гэсты фатаватага «першага каханка» выклікаюць незадаволенасць. Ілжывасць паводзін на сцэне і ілжывасць паводзін і ўчынкаў персанажа ў актора, відаць, зліліся ў адно разуменне. Ён застаецца зусім спакойным нават у той момант, калі Наталля выкрывае яго ашуканства: «А можа вы і не ездзілі нікуды». Гэта вельмі прыкра, тым больш, што актор валодае добрым, надзвычай прыемнага тэмбра голасам і багатай, выразнай дыкцыяй.

Не задавальняе ігра арт. В. Скакуна (Грунцоў). Ніякай спробы пранікнуць у сутнасць вобраза, нічога цікавага знешне не ўдалося актору даць у гэтай ролі. Тое-ж можна сказаць і пра ключніцу (Я. Зайчык). Вялікія магчымасці ролі не былі скарыстаны, яе цікавы змест застаўся не раскрытым. Знешне яе ключніца нагадвае Галчыху. Спачатку яна прабуе шапялявіць (відаць, такім чынам імкнучыся «індывідуалізаваць» вобраз). Але пасля пакідае гэты, з дазволу сказаць, «прыём характарыстыкі». Наогул артыстка адчувае сябе ў ролі неяк няўпэўнена.

В. Гаратаў (Сакердон) бледна, суха і невыразна штампуе «наогул лёкая».

Аб акторы Э. Шапко можна было-б не гаварыць, бо гэта актор «іншага становішча» ў тэатры. Але хочацца сказаць, што да работы нават у такім складзе выканаўцаў, які, можа быць, «не адпавядае гонару» гэтага артыста, можна было-б паставіцца сумленней, не кампілюючы асобных частак з усіх, раней іграных ролей. Часам забываеш, што гэта Потрахаў; здаецца, перад вамі санлівы мяккацелы Лыняеў, яшчэ крыху—і восьвось блісне штось ад «Праменнага паэта», а то, раптам, дурань, стультус загаворыць інтанацыямі Мантэкі: «Што такое? Што такое?» (сцэна на лесвіцы, 2-гі акт). Гэта тым больш прыкра, што ў ролі вельмі шмат матэрыялу, не гаворачы ўжо аб тым, што актор таленавіты.

Выкананне ролі Паліксены (арт. З. Ліцкая) невыразнае. Артыстка не зразумела сутнасці вобраза. Калі ўявіць сабе яе прадгісторыю, дык гэта — хутчэй за ўсё багатая купецкая дачка, якую ўзяў сабе за жонку з-за пасагу несумленны Потрахаў. Вобраз крыху выйграў, калі быў зменены грым.

На першых спектаклях перад гледачом з'яўляўся непраўдзівы дваісты вобраз капрызнай жанчыны, з трагічным выразам твару, пры агульным гратэскавым малюнку ролі. Цяпер у ролі знойдзена адзінства вонкавага малюнку і ўнутранага зместу. Але ўсё-ж паводзіны артысткі на сцэне разлічаны толькі на знешні эфект.

Мы пачалі аналіз гэтага спектакля трохі незвычайна — з разгляду ігры актораў, галоўным чынам таму, што спектакль меў педагагічныя мэты. Але ў рабоце над спектаклем, вядома, ці то з маладымі, ці з сталымі, спрактыкаванымі акторамі вялікае мейсца займае рэжысёр, яго задума, якая ў даным выпадку здаецца нам увогуле правільнай.

Рэжысёр акцэнтуе тут увагу на вобразе «маленькага чалавека», надзеленага вялікімі агульна-чалавечымі вартасцямі, які бачыць сэнс жыцця чалавека, яго найвышэйшае шчасце — у працы. У маналозе Карпелава пераканаўча гучыць асноўная думка п'есы аб перавазе працы над багаццем.

Толькі з прычыны таго, што п'еса «Запрацаваны хлеб» пераклікаецца з «Позным каханнем», патрабаваць нейкага зусім іншага вырашэння неабавязкова. Літвінаў тут, як і ў «Позным каханні», ужывае метад псіхалагічнага рэалізма, пры дапамозе якога найбольш поўна і ўсебакова можна раскрыць асноўныя ідэі і змест вобразаў своеасаблівых «ціхіх» п'ес Астроўскага. Але як і ў сваіх ранейшых пастаноўках («Рамэо і Джульета», «Позняе каханне») рэжысёр тут аддае больш увагі драматычным мейсцам п'есы, занядбаўшы яе камічныя элементы. Таму агульны аптымістычны жыццерадасны тон, які характэрны для п'ес Астроўскага, у спектаклі гучыць трохі прыглушана.

Да недахопаў пастаноўкі таксама адносіцца і нейкая рознастылёвасць спектакля. Увесь другі акт як-бы выпадае з агульнага стылю: ён увесь ідзе ў плане чыста знешняй ігры. Арт. Э. Шапко пацягнуў тут за сабою ўвесь ансамбль. Таму нават у канцы акта выдатны маналог Карпелава-Бараноўскага, прамоўлены акторам з сапраўдным пачуццём і палымяннасцю, гучыць не зусім пераканаўча, бо на сцэне ў гэты момант не ствараецца агульная атмасфера шчырасці.

Непрыемнае ўражанне пакідае таксама афармленне 2-га акта (мастак Б. Малкін), тым больш, што яно, як відаць, звязана з агульнай задумай рэжысёра. Дзіўным здаецца, што сур'ёзны і разумны рэжысёр, якога мы маем у асобе Літвінава, пайшоў на такі танны эфект, як абыгрываннe безгустоўнай, калі не сказаць непрыстойнай, карціны над лесвіцай. Вельмі наіўна і надумана гучаць мізансцэны каля карціны і на лесвіцы, якія абавязкова супадаюць з словамі ў тэксце п'есы аб «натуральнасці».

Але наогул пастаноўка «Запрацаваны хлеб» уяўляе сабой цікавую і прыемную з'яву, галоўным чынам таму, што дае падставы спадзявацца на далейшы рост актораў, занятых у спектаклі.

Т. БУШКО.

АКТОРЫ І РОЛІ

Каламбіна-Роззнблат

Каламбіна Роззнблат была дэбютам маладой артысткі пасля выступлення ў гэтай ролі выдатнага майстра балетнага мастацтва, народнай артысткі БССР З. Васільевай.

Роззнблат успрыняла ўзвышаную, паэтычную тэму Каламбіны. У яе пачуцці няма трагічных інтанацый — у ім багата святла, паўднёвага сонца і радасці.

Каламбіне ад традыцыйных масак камедыі дэль-артэ балетмайстра нават

Арт. Б. Роззнблат у ролі П'ерэты і арт. Сысоеў у ролі П'еро (Балет «Арлекінада»).

не пакінуў маскі, а апрануў яе ў звычайную балетную вопратку, у якой з аднолькавым поспехам можна танцаваць не толькі гэтую партыю, але і Марыю («Бахчысарайскі фантан») і нават Золушку («Золушка» С. Пракоф'ева). Толькі зграбная французская музыка Дрыго вызначае светлы, лірычны настрой гераіні і надае ёй пэўныя рысы лёгкага гумару. Пра пачуццё, якое нясе Роззнблат у гэтым вобразе, можна было-б сказаць словамі Гофмана, што «яно лунае ў чыстым нябесным агні, толькі ззяючы і сагравачы, але не знішчаючы гарачым полымем».

Каламбіне-Роззнблат не ўласцівы моцныя пачуцці. Яе арабэску, яшчэ не зусім скульптурнаму па форме, не хапае глыбокай эмацыянальнасці, але ў ім ужо ёсць зграбнасць і прывабнасць. У танцы Роззнблат яшчэ няма красамоўных падтэкстаў, паэмнасці, але ў ім ёсць свежасць пачуцця і жаночае хараство.

Міміка Роззнблат пазбаўлена балетнага стандарта. Яе пантаміма арганічна звязана з харэаграфічным вобразам.

Роззнблат не валодае ад прыроды вялікім крокам і моцным прыжком. У яе піруэтах, вярчэннях няма віртуознасці, але ёсць мяккасць, якая сагравае танец артысткі. Гэтая рыса і стварае паэтычнасць яе Каламбіны.

Лірычнасць больш уласціва Роззнблат, чым бурны драматызм і камізм. Маладая балерына прывабна ў адажыё і менш выразна ў імклівай варыяцыі. Пяшчотнасць адажыё патрабуе ўнутранай высакароднасці і культуры артысткі, і гэтымі якасцямі яна ў нейкай меры ўжо валодае.

У вобразе Каламбіны Роззнблат у светлых і радасных тонах сцвярджае гуманістычную тэму кахання. У гэтым—прынцыповае значэнне вобраза, які ўвасобіла на сцэне здольная артыстка.

М. МОДЭЛЬ.

Літаратурны КАЛЕНДАР

КАРУСЬ КАГАНЕЦ

20-га мая 1918 года ў фальварку Юцкі, недалёка ад Койданава, памёр вядомы беларускі пісьменнік, драматург і паэт Карусь Каганец (Казімір Кастравіцкі).

Пасля сваёй смерці ён пакінуў значную літаратурную спадчыну. Сярод твораў, што напісаў К. Каганец, асабліва вылучаюцца—камедыя «Модны шляхцюк», драма «Сын Даніла», соцыяльна-бытавая п'еса «У іншым шчасці няшчасце схавана», апавяданні — «На сплаў», «Новасадскае замчышча», «Што кажух, то не вата», «Прылукі», «Машэка», вершы — «Нёман», «Наш покліч», «Кабзар» ды інш.

Карусь Каганец быў адданым змагаром за вызваленне народа. У 90-х гадах, калі пачыналася літаратурная дзейнасць пісьменніка, ён удзельнічаў у рэвалюцыйных гуртках. За ўдзел у рэвалюцыйным руху К. Каганец быў пасаджаны ў Мінскі астрог, дзе ў той час адбываў пакаранне Якуб Колас.

Першым творам К. Каганца з'яўляецца «Прамова», якая была напісана ў 1893 годзе і надрукавана ў 1910 годзе ў нумары 7 газеты «Наша ніва». «Прамова» прасякнута любоўю да роднага краю, да яго народа і культуры. З замілаваннем К. Каганец пісаў пра чароўную прыроду Беларусі: «Уніз, аж да рэчкі, гара зараснікам пакрыта, уся арэшнікам, чаромхай, каліннікам ды маліннікам зарасла. А чаромха-то цвіце, няйначай хто пухам лябяжым укрыў, і пах за вёрсты нясе. А рэчка сама—моў стужка блакітная, між верб ды альшын ветрам раскінутая. А за рэчкай лука аж зіхаціць кветкамі. А далей за лукой поле зелянее. А ўвакол усяго цёмны лес сінее». Як сапраўдны патрыёт, К. Каганец рашуча асуджаў тых, хто выракаўся сваёй роднай мовы, культуры і звычаяў. У той-жа «Прамове» ён пісаў: «Ці справядліва гэта—усяго, што сваё, чурацца: і мовы свае, і звычаю свайго, і вопраткі свае?».

Дасціпную сатыру на фанабэрыстага шляхцюка, які пагарджаў звычаямі і мовай свайго народа, стварыў пісьменнік у п'есе «Модны шляхцюк». Пранцішак Карчэўшчык—пусты, нікчэмны чалавек. Аднак, гэта не перашкаджае яму выдаваць сябе за моднага, адукаванага шляхцюка. Уся яго культура заключаецца ў тым, што ён размаўляе па-польску і носіць белую манішку і рукаўчыкі на голым целе. «Вучоны, вучоны! Бульбу ад рэпы не распазнае. А гаворыць, дык так, што і зразумець яго трудна. Нашай мовы сароміцца» — так характарызуе Карчэўшчыка простая сялянская дзяўчына Ганна, да якой ён спрабуе заляцацца. Ставячы свайго героя ў камічныя сітуацыі, пісьменнік высмейвае духоўную спустошанасць Карчэўшчыка. У процілежнасць яму Ганна намалявана, як сціплая, простая і працавітая дзяўчына. Яна, як і яе бацька, ненавідзіць Карчэўшчыка за яго адшчапенцтва і процідзеянне сябе народу.

Карусь Каганец, як драматург, заслугоўвае асаблівай увагі. Ён шмат зрабіў для стварэння беларускага нацыянальнага тэатра. Вобраз моднага шляхцюка атрымаў далейшае больш поўнае ўвасабленне ў камедыі «Пазнанка» Янкі Купалы.

П'есы К. Каганца цікавыя не толькі тым, што напісаны яны жывой народнай мовай, што ў іх рэалістычна адлюстраваны сялянскі быт, але і тым, што пісьменнік у іх паказвае соцыяльна-класавыя адносіны. Так, у п'есе «У іншым шчасці няшчасце схавана» К. Каганец, малюючы трагедыю маладой сялянкі Марылі і парабка Астапа, давёў, як соцыяльна несправядлівы лад нявечыў людзей. Астап і Марыля шчыра кахалі адзін аднаго. Але іхняму шчасцю не суджана было здзейсніцца. Марыля памерла, не перанёсшы панскай ганьбы, а Астап спачатку трапіў у салдаты, а затым у астрог. Пісьменнік паказаў, што ў сялянскіх масах выспявалі пратэст і бунт супроць несправядлівасці тагачаснага ладу. «Вот і шукай праўды на свеце!.. Здаецца, хто-б, а то паны! Пойдзеш у двор—такія, здаецца, добрыя, так аб усім хораша гавораць. А паглядзіш, дык вось што вытвараюць... Ну, я гэтаму панічу не дарую, папомніць ён мяне»—гаворыць Марылін брат.

К. Каганец вельмі цікавіўся беларускім фальклорам. Шмат якія з яго апавяданняў напісаны на тэмы народных паданняў, легенд («Новасадскае замчышча», «Прылукі», «Машэка»).

У мінулым К. Каганца цікавяць моцныя духам, валявыя натуры. Княжна з апавядання «Новасадскае замчышча» палічыла за лепшае памерці, чым жыць у багацці, але без шчасця і радасці. «Няма ў мяне ні шчасця, ні долі, ні вернага друга,—няма мне з кім дзяліцца ні сваёю красою, ні каханнем, ні багаццвам вялікім, а моладасць мая ўцякае, лічка мае бела пажаўцела, грудзі мае поўныя сталі вянуць, вочкі карыя—ліняць, буйныя косы—выпадаць, а сэрца мае стала заміраці... Няхай-жа, калі так, я загіну; усё за мной: і думкі мае, і каханне маё, жаданні, і краса, і багацтва маё, бо так сіратліва жыці не пад сілу мне!».

Мяккім гумарам, дасціпным жартам і мудрасцю прасякнута апавяданне «Што кажух, то не вата» і байка «Журавель і чапля», якія напісаны па фальклорных матывах.

Але К. Каганец не абмяжоўваўся толькі апрацоўкай фальклорных твораў. Ён таксама пакінуў у спадчыну рэалістычныя апавяданні з жыцця беларускіх сялян («На сплаў», «З нашага жыцця», «Забойства ў пушчы» і інш.).

Тыя-ж тэмы—любоў да народа і роднай краіны, нянавісць да ворагаў-прыгнятальнікаў, гістарычнае мінулае народа—распрацоўвае К. Каганец і ў сваіх вершаваных творах. На яго вершах вельмі прыкметны ўплывы народных песень.

Творы К. Каганца раскіданы па розных перыядычных выданнях (календары, газеты «Наша ніва», «Вольная Беларусь», «Беларусь»). Асобнымі кнігамі яны яшчэ да гэтага часу не выдаваліся.

Р. ШКРАБА.

Абмеркаванне новай паэмы Антона Бялевіча

Беларускі паэт Антон Бялевіч закончыў работу над сваёй новай паэмай «Сям'я». У рэдакцыі «Літаратура і Мастацтва» адбылося абмеркаванне гэтай паэмы, у якім прынялі ўдзел Алесь Кучар, Янка Шарахоўскі, Піліп Пестрак, Георгі Таран, Янка Брыль, Анатоль Астрэйка, Валянцін Таўлай, Ул. Агіевіч, Ніна Тарас і іншыя.

Яны адзначылі, што паэма робіць на чытача вельмі моцнае ўражанне сваёй вобразнасцю, пачуццёвасцю і сведчыць аб вялікім творчым дасягненні паэта.

ГОМЕЛЬСКІЯ МАСТАКІ

Да Айчыннай вайны ў Гомелі штогод наладжваліся мастацкія выстаўкі. Значэнне іх у культурным жыцці горада было вельмі вялікае. Выстаўкі шырока папулярызавалі мастацтва сярод працоўных, выяўлялі новыя таленты, узнімалі пачуццё адказнасці мастакоў за сваю работу, спрыялі іх творчаму росту.

Увагу наведвальнікаў гомельскіх выставак заўсёды бралі карціны мастакоў Звенігародскага і Шаўчэнкі. Гэтыя кваліфікаваныя майстры жывапісу і цяпер працуюць у Гомелі. За апошні час імі напісана многа новых твораў.

Звенігародскі напісаў серыю добрых пейзажаў, зрабіў эскізы разбурэнняў, што ўчынілі ў Гомелі фашысцкія захопнікі; некалькі карцін пра аднаўленне горада. У эскізе «Гомель у сакавіку 1946 года» ён паказаў драўляную ўскраіну Гомеля на фоне адноўленых заводаў і шматлікіх новабудоўляў.

Глядач бачыць на палатне не толькі сённешні, разбураны Гомель. Ён бачыць у перспектыве Гомель заўтрашняга дня.

Работы Звенігародскага, сціплыя і стрыманыя па знешняму афармленню, вылучаюцца рэалістычнай манерай пісьма і глыбокім зместам.

Гэтага нельга сказаць аб некаторых новых творах мастака Шаўчэнкі. Яго эфектныя, маляўнічыя эскізы «Фізкультурнае свята на Сожы», «Гомель зімой», «Куточкі парка» і інш. сведчаць аб тым, што мастак падыходзіць да адлюстравання жыцця з вузка эстэцкага пункту погляду. Цудоўна перадаючы знешняе аблічча натуры, ён не раскрывае яе сутнасці.

Найбольш яскрава эстэтызм і сузіральнасць мастака выявіліся ў эскізе «Чырвонаармейцы каля вогнішча». Пачуцці і імкненні чырвонаармейцаў у карціне зусім не раскрыты. Усе свае намаганні мастак накіраваў на пейзаж, на адлюстраванне цемры ночы і барвовага водбліску вогнішча. Пагоня за знешнім зрокавым эфектам зніжае жыццёвую вартасць цікава задуманага твору.

Шаўчэнка ўпарта працуе над формай, над выяўленнем чыста жывапісных задач. Ён настойліва імкнецца авалодаць майстэрствам перадачы колеру. Мы не хочам дакараць яго гэтым, бо колер—мова жывапісу. Аднак, гэтай мовай мастак здолеў-бы расказаць аб іншым—аб гераічных справах і людзях нашага горада, што паўстае з руін, аб росце народнай гаспадаркі і культуры, аб пафасе нашай творчай працы. Такіх твораў маюць права чакаць ад Шаўчэнкі працоўныя горада.

Што датычыцца да маладых мясцовых мастакоў (Казачэнка, Вуколаў і інш), дык яны яшчэ не выйшлі з стадыі вучнёўства. Яны спрабуюць свае сілы і ў пейзажы, і ў партрэце, і ў гістарычных палотнах аб Айчыннай вайне і партызанскім руху, але ў іх работах покуль няма творчай самастойнасці.

Гэтым мастакам трэба шмат і ўпарта працаваць, каб авалодаць дасягненнямі класікаў жывапісу і выдатных сучасных майстроў.

Такая-ж задача стаіць і перад пачынаючымі мастакамі, якія жывуць на перыферыі. Іх патрэбна аб'еднаць у гурткі і забяспечыць перыядычнай кансультацыяй з боку кваліфікаваных мастакоў.

Першыя крокі ў гэтым напрамку ўжо зроблены Гомельскім абласным Домам народнай творчасці.

Летам гэтага года ў Гомелі будзе праведзены першы, пасля заканчэння вайны, агляд жывапісу і графікі прафесіянальных мастакоў і мастакоў-самавучак горада і вобласці. Пажадана, каб гэты агляд быў пачаткам сталай сувязі паміж мастакамі і шырокай грамадскасцю і адначасова-бы спыненую вайной традыцыю штогодніх абласных мастацкіх выставак.

Э. РОТШТЭЙН.

г. Гомель.

„Літаратурна газета“ № 19

Украінская літаратурная газета № 19 ад 9 мая 1946 г. на першай старонцы змясціла Загад Міністра Узброеных Сіл Саюза ССР, Генералісімуса Совецкага Саюза І. Сталіна.

Пятро Казланюк і Г. Гельфандбейн у артыкулах—«Год творчай працы» і «У пісьменнікаў Харкава» расказваюць пра творчасць пісьменнікаў Львова і Харкава на працягу першага пасляваеннага года.

Разгляду твора Вадзіма Сабко—«Каўказ», прысвечаны артыкул К. Васілёнка—«Кніга пра баявую дружбу». Пра вобраз І. В. Сталіна ва ўкраінскай паэзіі гаворыцца ў артыкуле Л. Вышаслаўскага «Слова ад сэрца».

У нумары таксама надрукаваны артыкулы Л. Навічэнка—«Нарыс у газеце», Паўла Усэнка—«Яны сярод нас»—памяці пісьменнікаў, якія загінулі на фронце, А. Гозенпуда «Немагчымасць павароту да старога»—пра аповесць Д. Прыстлі «Трое ў новых гарнітурах», нарыс Сямёна Склярэнка—«У майскі дзень» і вершы А. Кацнельсона—«9 мая 1945 года», Сямёна Гардзеева «Перамога» і Яраслава Шпорта «Перажытае».

Новыя творы мастака В. А. Фаворскага

Выдатны совецкі мастак-графік В. А. Фаворскі закончыў працу над серыяй гравюр па дрэву, прысвечаных вялікім рускім палкаводцам. У серыю гравюр увайшлі партрэты Дзмітрыя Данскога, Аляксандра Неўскага, Кузьмы Мініна, Дзмітрыя Пажарскага, Аляксандра Суворава, Міхаіла Кутузава.

Арт. В. Казакова ў ролі Мірандаліны («Гаспадыня гасцініцы» ў Гомельскім абласным тэатры).

Фота У. Кітас і А. Мартынава.

Рэдкалегія: Л. Александроўская, А. Багатыроў, Г. Глебаў, Якуб Колас, А. Куляшоў (адказны рэдактар), А. Кучар (намеснік адказнага рэдактара), П. Пестрак, Г. Таран.

АТ 02332 Друкарня «Чырвоны Друкар», Рэвалюцыйная, 12. Адрас рэдакцыі: Рэвалюцыйная, 2